В. А. Грачова, Ю. Ю. Захарына, С. І. Колбышава

# МАСТАЦТВА
## (АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА)





5 клас



З электронным дадаткам

**В. А. Грачова, Ю. Ю. Захарына, С. І. Колбышава**

# МАСТАЦТВА
## (АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА)

Вучэбны дапаможнік для 5 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

(з электронным дадаткам)

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2016

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

УДК 7(100).03(075.3=161.3)
ББК 85я73
Г78

Пераклад з рускай мовы *Т. К. Слауты*

Р э ц э н з е н т ы: аддзел экранных мастацтваў дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, загадчык аддзела *А. А. Карпілава*); настаўнік айчыннай і сусветнай мастацкай культуры, настаўнік па класе фартэпіяна вышэйшай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 8 г. Мінска» *А. У. Міхайлоўская*

**Грачова, В. А.**

Г78 Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура) : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з белarус. мовай навучання (з электронным дадаткам) / В. А. Грачова, Ю. Ю. Захарына, С. І. Колбышава ; пер. з рус. мовы Т. К. Слауты. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2016. — 128 с. : іл.

ISBN 978-985-471-904-7.

**УДК 7(100).03(075.3=161.3)**
**ББК 85я73**

**ISBN 978-985-471-904-7 (асоб. выд.)**
**ISBN 978-985-471-911-5**

© Грачова В. А., Захарына Ю. Ю., Колбышава С. І., 2016
© Слаута Т. К., пераклад на беларускую мову, 2016
© Афармленне. РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2016

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Дарагія сябры!

Вы пазнаёміцеся з новым вучэбным прадметам «Мастацтва». Паспрыяе гэтаму вучэбны дапаможнік, знаёмства з якім адкрые вам асаблівы свет — свет мастацтва. Ён напоўнены дзіўнымі фарбамі і гукамі, «гаваркімі» лініямі і формамі, выразнымі словамі і рухамі. Вы будзеце вучыцца разумець і адчуваць свет мастацтва. Даведаецеся, што кожны твор непаўторны і ўнікальны. У адным знаходзіць адлюстраванне жыццё канкрэтнага чалавека, у іншым — лёс краіны або нават усяго чалавецтва.

У вандроўцы вам дапамогуць каляровыя ілюстрацыі. Вы пазнаёміцеся з выдатнымі помнікамі архітэктуры, творамі выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, літаратуры і музыкі.

Каб твор мастацтва адкрыў вам свае таямніцы, ставіцца да яго трэба вельмі паважліва. Будзе добра, калі вы з сябрамі і бацькамі пафантазіруеце, прыдумаеце штосьці, увасобіце ў жыццё творчыя задумы. Так вы зможаце таксама стаць трошкі мастакамі.

У вучэбным дапаможніку вам прапануецца мноства заданняў, якія могуць стаць пачаткам вашай творчасці. Кожнае з іх — толькі зыходны пункт цікавага падарожжа ў свет мастацтва, у якім мастак — менавіта вы. Веды і вопыт, атрыманыя вамі на ўроках выяўленчага мастацтва і музыкі, абавязкова дапамогуць вам.

Разважайце, дзяліцеся сваімі ўражаннямі, задавайце адзін аднаму пытанні, наведвайце музеі і выставы, хадзіце ў тэатры, глядзіце

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

кінафільмы і тэлеперадачы! І вам захочацца стварыць нешта сваё. А вучэбны дапаможнік паспрыяе вам у гэтым, падкажа ідэі.

Ствараць — гэта вялікае задавальненне. А якая радасць, калі зробленае табой знаходзіць свайго гледача.

У рабоце вам дапаможа кампакт-дыск, які ўключае не толькі творы мастацтва, але і творчыя заданні. Спасылкі на кампакт-дыск, якія змешчаны ў вучэбным дапаможніку, перададзены наступнымі ўмоўнымі абазначэннямі: для твораў выяўленчага мастацтва выкарыстоўваецца значок , літаратурнага тэксту — , музычнага твора — , кіно — .

Далучэнне іншых інфармацыйных крыніц абазначаецца значком .

У якасці дадатковага матэрыялу вам прапануюцца літаратурныя і літаратурна-музычныя старонкі, якія дапамогуць адказаць на пытанні і выканаць заданні. Гэты дадатковы матэрыял пазначаны значком .

У добры шлях!

*Аўтары*

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Тэма 1

# Уводзіны ў свет мастацтва

Мастацтва — самы выдатны, самы строгі і самы радасны... шлях чалавека да дабра, да праўды і дасканаласці.

*Томас Ман*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**А́ўгуст Фры́дрых Зі́герт.** Юны знаўца мастацтва

# § 1. Што такое мастацтва?

Штодзённа мы сустракаемся са словам «мастацтва». І гэта не дзіўна — мастацтва заўсёды побач з намі. Мы чуем гукі музыкі, бачым жывапісныя і скульптурныя работы. Вакол нас архітэктурныя збудаванні. Творы мастацтва могуць здзіўляць, уражваць, захапляць.



Чырвонафігурная пеліка (6 ст. да н. э.)

Аднак ці зможам мы адразу адказаць на пытанне *«Што такое мастацтва?»*.

Не варта засмучацца, калі гэтае пытанне выклікае цяжкасць. Даследчыкі ўсяго свету шукаюць на яго адказ, але так і не могуць прыйсці да адзінага тлумачэння слова «мастацтва». Толькі ў адным усе спецыялісты згаджаюцца — простага і адназначнага адказу на гэтае пытанне не існуе.

Разам з тым важным з'яўляецца і іншае пытанне *«Чаму людзі ва ўсе часы ў розных кутках планеты імкнуцца да зносін з мастацтвам?»*.



Малюнак бізона ў пячоры Альтаміра (Іспанія)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ужо са старажытных часоў чалавек ствараў малюнкі і рэльефы ў каменных пячорах. Гэта былі адбіткі рук, малюнкі жывёл, сцэны палявання. Пазней з'явіліся ўнікальныя малюнкі на посудзе, прыладах працы, ювелірных вырабах. Удасканальвалася жыллё — ад невялікіх збудаванняў, такіх, як шалаш, зямлянка, да складаных і не проста вялікіх, а гіганцкіх па сваіх памерах.

Чым жа можна патлумачыць цікавасць чалавека да такой цяжкай працы? Чаму, нягледзячы на няпростыя ўмовы жыцця, ён знаходзіў час і магчымасці для стварэння твораў мастацтва? І галоўнае — навошта гэта было патрэбна?

На гэтыя пытанні адказаць няпроста. Аднак менавіта жаданне *захаваць* прадметы і з'явы навакольнага свету — на сценах пячоры, на асколку каменя ці на палатне — стала пачаткам нараджэння мастацтва.



Шлем старажытнарымскага воіна



Залатая пектараль — ювелірнае ўпрыгажэнне скіфаў



Амфітэатр Калізе́й (г. Рым, Італія)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Саркафаг муз са Старажытнага Рыма. 2 ст. Луўр (г. Парыж, Францыя)

Не адразу мастацтва стала такім, якім мы яго сёння ўспрымаем, наведваючы музеі, выставы або канцэртныя залы. У старажытнасці яно з'яўлялася часткай паўсядзённага жыцця чалавека. Напрыклад, перад паляваннем ён маляваў жывёлу, на якую збіраўся паляваць. Лічылася, што ў такім выпадку пашанцуе. З дапамогай музыкі і спеваў



**Камі́ль Каро́.**
Арфе́й і Эўрыды́ка
(фрагмент карціны)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

чалавек звяртаўся да духаў, каб тыя дапамаглі яму ў здзяйсненні задуманага...

**Íкцін і Калікра́т.** Парфено́н
**Мнесíкл.** Эрэхтэён

Мастацтва вылучылася ў асобную, *самастойную*, сферу дзейнасці чалавека значна пазней. Пра гэта гаворыцца ў старажытнагрэчаскім міфе пра бога Апалона, які сабраў вакол сябе дзевяць муз — апякунак мастацтва. Кожная муза ўвасабляла адзін з відаў мастацтва — паэзію, музыку, танец, тэатр...

Аб чароўнай сіле мастацтва нам апавядаюць шматлікія мастацкія творы. У вядомым міфе Старажытнай Грэцыі «Арфей і Эўрыдыка» расказваецца аб тым, як сіла музыкі змагла спыніць вечны кругаварот прыроды.

Такая сіла гучала ў песні Арфея, так пакарала яна і вабіла да спевака, што вакол яго, як зачараваныя, стоўпіліся дзікія звяры, якія пакінулі навакольныя лясы і горы. Птушкі зляцеліся слухаць спевака. Нават дрэвы рушылі з месца і акружылі Арфея; дуб і таполя, стройныя кіпарысы і шыракалістыя платаны, хвоі і елкі тоўпіліся вакол і слухалі спевака; ні адна галінка, ні адзін ліст не дрыжаў на іх. Уся прырода здавалася зачараванай дзіўным спевам і гукамі кіфары Арфея.

*М. А. Кун.*
*Легенды і міфы Старажытнай Грэцыі*

Гэты літаратурны ўрывак сугучны мелодыі з оперы Кры́стафа Вілібáльда Глю́ка «Арфей і Эўрыдыка», створанай на аснове вядомага міфалагічнага сюжэта.

Старажытнагрэчаскія міфы «Апалон і му́зы», «Арфей і Эўрыдыка»

**К. В. Глюк.** Мелодыя для флейты з оперы «Арфей і Эўрыдыка»

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Дзякуючы майстэрству кампазітара мы не проста даведваемся аб дары Арфея, мы чуем дзіўную мелодыю. Выразны тэмбр флейты, поўныя светлага смутку сыходныя інтанацыі мелодыі перадаюць стан Арфея, які моліцца аб выратаванні Эўрыдыкі. Злыя сілы не могуць супрацьстаяць сіле мастацтва і паступова адыходзяць.

Пазнаёміўшыся з мастацкімі творамі, вы даведаліся аб значэнні мастацтва ў жыцці чалавека. А вось што такое мастацтва, вы зразумееце, калі ўважліва прачытаеце гэты вучэбны дапаможнік. І вельмі добра, калі ў кожнага з вас з'явіцца свой адказ...

### Пытанні і заданні

1. У мінулыя часы слова «мастацтва» было сугучным слову «майстэрства» і азначала наяўнасць высокага ўзроўню прафесійных якасцей і ўменняў майстра. Напрыклад, можна сказаць як «майстэрства» рамесніка, так і «мастацтва» рамесніка. Як вы думаеце, чаму?

2. Уважліва разгледзьце творы, якія прадстаўлены ў параграфе. Якія сюжэты пераважаюць у іх?

### Творчая майстэрня

3. Успомніце свой любімы твор мастацтва. Падрыхтуйце пра яго вуснае апавяданне (5–6 сказаў). Адкажыце на пытанне «Чаму мне падабаецца гэты твор мастацтва?».

Праслухайце на кампакт-дыску мелодыю для флейты з оперы К. В. Глюка «Арфей і Эўрыдыка».

Падбярыце ў вучэбным дапаможніку або ў інфармацыйных крыніцах адзін твор жывапісу, сугучны характару музыкі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Тэма 2
# Роля мастака ў мастацтве

Художник — деятель искусства.
В картинах отражает он
События, природу, чувства,
Связь поколений и времён…

*О. Пове́щенко*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Алег Куку́шкін.** Мастак

## § 2. Пра што расказвае мастак?



**Пэр Барэль дэль Каса.**
Уцякаючы ад крытыкі

Творы мастацтва вакол нас з дзяцінства. Цяжка ўявіць чалавека, якога мастацтва пакідае абыякавым. Самі таго не заўважаючы, мы дзелімся з сябрамі ўражаннямі ад прагледжанага фільма, праслуханай музыкі, разважаем пра тое, што нам спадабалася або не спадабалася і чаму.

А цяпер паспрабуйце ўявіць, што мастацтва знікла з нашага жыцця. Няма музыкі, паэзіі, тэатра і кіно... Вядома, свет без мастацтва не спыніць свайго існавання. Застануцца сонца, неба, зоркі, розныя цікавыя прафесіі. Застанецца сам чалавек. Аднак яго жыццё стане нашмат бяднейшым, таму што менавіта мастацтва ўзбагачае яго разнастайнымі фарбамі, напаўняе яркімі эмоцыямі і ўражаннямі.

Мастацтва — універсальная мова зносін. Яе разумеюць людзі незалежна ад узросту, нацыянальнасці і прафесіі.

**А́ўтар** — стваральнік мастацкага твора.

Кожны чалавек спасцігае мастацтва па-свойму. Хтосьці можа бясконца доўга ўглядацца ў маляўнічыя палотны, хтосьці не развітваецца з музыкай. А хтосьці, як хлапчук на карціне Пэра Барэ́ля дэль Ка́са «Уцякаючы ад крытыкі», гатовы ўявіць сябе часткай твора мастацтва. Магчыма, у будучым ён стане мастаком, кампазітарам або паэтам.

Працэс стварэння мастацкага твора загадкавы і таямнічы. Ніхто не можа адказаць на пытанні, дзе мастак бярэ ідэі для твораў і як фантазія аўтара ператварае ідэю ў зрокавы або слыхавы вобраз.

Азірніцеся навокал! Перад вамі — свет, напоўнены разнастайнымі пачуццямі, думкамі, ідэямі, падзеямі. Усё гэта можа стаць *тэмай* мастацкага твора.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Напрыклад, на карціне мастака Валянціна Аляксандравіча Сяро́ва — звычайная дзяўчынка. Магчыма, яна падобная на каго-небудзь з вашых знаёмых? Цяпер паназіраем за дзяўчынай, якая сядзіць на гранітнай скале. Аб чым яна так кранальна сумуе? Што асаблівага бачаць паэты і мастакі ў скульптуры «Малочніца», створаной рускім скульптарам Паўлам Пятровічам Сакало́вым?



**Валянцін Сяроў.**
Дзяўчынка з персікамі

И ослепительно стройна,
Поджав незябнущие ноги,
На камне северном она
Сидит и смотрит на дороги...

*А. А. Ахматова*

**Ж. Лафантэ́н.** Байка «Малочніца»



**Павел Сакалоў.**
Фантан «Малочніца»
(Царскае Сяло, Расія)

Англійскі жывапісец Майлс Фо́стэр намаляваў выразную сцэнку з сельскага жыцця. Дом, сям'я, дзеці — вечныя тэмы ў мастацтве.

А ў музычным творы Мікалая Андрэевіча Рымскага-Ко́рсакава «Сеча пры Кержанцы» — эпізод гістарычнай бітвы. Калі быць уважлівым, то можна не толькі пачуць гукі бітвы, адчуць рытм коней, якія скачуць, але і ўявіць вобразы людзей, якія ваюць.

Свет мастацтва здзіўляе. Ён нібы вытканы са шматлікіх тэм і сюжэтаў. Кожны новы твор мастацтва — новая сустрэча і новая загадка. Засталося толькі пастарацца разгадаць яе...

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Майлс Бёркет Фостэр.**
Кальцо з руж



**Мікала́й Рэ́рых.**
Сеча пры Кержанцы

### Пытанні і заданні

Прачытайце на кампакт-дыску байку Ж. Лафантэна «Малочніца». Разгледзьце скульптурную выяву П. П. Сакалова з аднайменнай назвай. Ці падобны, на ваш погляд, вобраз малочніцы Ж. Лафантэна на вобраз, захаваны ў скульптуры? Патлумачце свой адказ.

Праслухайце ў інфармацыйных крыніцах сімфанічную карціну М. А. Рымскага-Корсакава «Сеча пры Кержанцы». Уважліва разгледзьце рэпрадукцыю карціны М. К. Рэрыха «Сеча пры Кержанцы». Падбярыце словы, якія характарызуюць абодва творы мастацтва.

### Творчая майстэрня

Падбярыце ў інфармацыйных крыніцах да аднаго з твораў жывапісу і скульптуры з параграфа музычны твор, сугучны яго настрою. Патлумачце свой выбар.

## § 3. Інструменты і матэрыялы мастака

Для таго каб наблізіцца да разгадкі таямніцы мастацкага твора, паспрабуем прыадкрыць заслону і паназіраць за працэсам яго стварэння. Зазірнём у мастацкую майстэрню. Што нас там чакае?

Спачатку мы ўбачым аўтара мастацкага твора. Незалежна ад таго, над чым працуе аўтар — над карцінай, скульптурай ці музычным творам, мы будзем называць яго Мастаком. Мастаком з вялікай літары...

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Мастак выбірае *тэму* будучага твора і *сродкі*, якія спатрэбяцца для яго мастацкага ўвасаблення. Адзін Мастак выкарыстоўвае *колер*, другі выбірае *слова*, трэці — *гук*...

У кожнага віду мастацтва свая мова. Нельга да канца зразумець чалавека, калі размаўляць з ім на розных мовах. Так і ў мастацтве. Каб зразумець Мастака, трэба разумець мову, на якой ён размаўляе.



**Вінсэнт Ван Гог.**
Сланечнікі

Галандскі мастак Вінсэ́нт Ван Го́г пры напісанні карціны «Сланечнікі» выкарыстоўваў сакавітыя аранжавыя і жоўтыя тоны. Можна меркаваць, што яркая каляровая гама з’яўляецца ўвасабленнем сонца і радасці. Сланечнікі здаюцца жывымі, напоўненымі асаблівай энергіяй — вось-вось і галоўкі кветак нахіляцца да нас і прашэпчуць аб чымсьці вельмі важным...

Якія ж інструменты і матэрыялы спатрэбіліся жывапісцу ў яго працы? Карціна французскага мастака Франсуа́ Бушэ́ «Мастак у майстэрні» падкажа адказ. Разглядзеўшы яе, вы заўважыце палатно, палітру, фарбы, пэндзлі...



**Франсуа Бушэ.**
Мастак у майстэрні
(аўтапартрэт)

У скульптуры Эцье́на Мары́са Фальканэ́ «Пагрозлівы Амур» бог кахання Амур намаляваны ў вобразе гуллівага і трохі загадкавага хлопчыка. Прыціскаючы пальчык да вуснаў, ён заклікае нас да маўчання, дзякуючы чаму мы, гледачы, нібы становімся саўдзельнікамі тайны юнага бажаства.

Якія інструменты і матэрыялы выкарыстоўвае скульптар? І зноў падказка. На карціне італьянскага мастака Віто́рыа Рынья́на «У майстэрні скульптара» мы бачым майстра, які трымае ў адной руцэ разец, у другой — амаль гатовую фігурку хлопчыка на шары.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Эцьен Марыс Фальканэ.**
Пагрозлівы Амур



**Віторыа Рыньяна.**
У майстэрні скульптара

У сваёй працы скульптары выкарыстоўваюць альбо цвёрдыя матэрыялы — мармур, дрэва, альбо пластычныя матэрыялы — гліну, воск...

Апавяданні, казкі, вершы складаюцца са слоў. З дапамогай слоў мы размаўляем з сябрамі. Але слова з'яўляецца таксама асноўным сродкам выразнасці мовы пісьменніка і паэта.

Поспевает брусника,
Стали дни холоднее,
И от птичьего крика
В сердце стало грустнее...

*К. Д. Бальмонт. Осень*

Лілею млявы плёс люляе,
З-пад злежаных аблок здалёк
Ляціць, віхлясты і бялявы,
Пялёстак лёгкі — матылёк.

*Р. І. Барадулін. Матылёк*

Разам з Канстанцінам Дзмітрыевічам Бальмóнтам мы назіраем за прыродай, якая рыхтуецца да зімовага сну. Высока-высока

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пралятае чарада птушак. Чутны іх развітальны крык і шум крылаў. Кранальны і пяшчотны вобраз можна таксама ўявіць, прачытаўшы верш Рыгора Іванавіча Барадуліна. Паэт «намаляваў» маленькага матылька ў адным чатырохрадкоўі. Так і хочацца падставіць яму далоньку!

**Сро́дкі маста́цкай выра́знасці** — мова, з дапамогай якой розныя мастацтвы маюць зносіны з намі.

Музычнае мастацтва ствараецца з дапамогай гукаў. Выкарыстоўваючы разнастайнасць іх спалучэнняў, кампазітар «малюе» вобразы чалавека, прыроды, з'яў навакольнага свету. У музыцы мы можам пачуць інтанацыі чалавечай гаворкі, смеху, плачу. А можам, слухаючы яе, уявіць, як маршыруюць салдаты, танцуюць дзеці, адчуць подых ветру або шум марскога прыбою.

**Маста́цкая тво́рчасць** — дзейнасць чалавека, у якой ствараюцца мастацкія вобразы.

Савецкі кампазітар Арам Ільіч Хачатуран у знакамітым «Вальсе» здолеў перадаць слухачу найглыбейшыя чалавечыя хваляванні. Парывістая, страсная, усхваляваная музыка вальса звяртае нас да чалавека — яго пачуццяў і пакут. Музыка танца са знакамітага Астрамечаўскага рукапісу «малюе» іншую карціну: спакойнае, велічнае шэсце пары ў прыгожых строях на балі ў велізарным старадаўнім замку.

Архітэктуру часта называюць «застылай музыкай». Як няма двух аднолькавых музычных твораў, так няма двух аднолькавых помнікаў архітэктуры. Любы твор архітэктара — жылы дом, бібліятэка або мост — адлюстроўвае яго ўяўленне аб прыгажосці.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Джава́ні Марыя Бернардо́ні.**
Касцёл Божага цела (Фарны) (г. Нясвіж, Беларусь)



**Уладзімір Жба́наў.**
Дойлід (г. Мінск, Беларусь)

У музыцы «малююць» гукам. У паэзіі выкарыстоўваецца слова. Сродак выразнасці ў жывапісе — колер. У архітэктуры і скульптуры важнымі з'яўляюцца форма і аб'ём. Калі вы навучыцеся разумець асноўныя сродкі выразнасці ў розных відах мастацтва, то пачуеце голас Мастака і наблізіцеся да таямніцы яго твора.

### Пытанні і заданні

1. Разгледзьце творы мастацтва, прадстаўленыя ў параграфе. Назавіце, да якіх відаў мастацтва яны адносяцца.

### Творчая майстэрня

2. У параграфе паказана майстэрня жывапісца і скульптара. Назавіце інструменты і матэрыялы, якімі карыстаюцца кампазітар і пісьменнік.

3. Якія інструменты і матэрыялы неабходны фатографу? Як вы думаеце, чаму інструменты і матэрыялы фатографа адрозніваюцца ад інструментаў і матэрыялаў жывапісца, скульптара?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Тэма 3
# Цудоўнае ў мастацтве

...Голас прыгажосці гучыць ціха: ён пранікае толькі ў самыя чуйныя вушы.

*Ф. Ніцшэ*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Леана́рда да Ві́нчы.** Мадонна Літа

# § 4. Прыгажосць у мастацтве і жыцці

*«Як прыгожа!»* — гэтыя словы хоць раз у жыцці прамаўляе кожны чалавек. На пытанне *«Што прыгожа?»* адказаць не складана. Адчуванне прыгажосці выклікаюць кропля дажджу на пажоўклым кляновым лісце, мудрагелістая форма сняжынкі, вячэрні закат. Мы захапляемся маляўнічым палатном, скульптурай, мелодыяй і паэтычным радком.

Знайсці адказ на пытанне *«Чаму гэта прыгожа?»* значна складаней. Магчыма, мы проста *адчуваем* прыгажосць розных з'яў і выказваем сваё захапленне з дапамогай слова «прыгожа»? А ці заўсёды мы задумваемся, што азначае гэта слова?

**Ідэа́л** — найлепшы, дасканалы ўзор.

Прыгожы чалавек... Гэта чалавек з прыгожымі, правільнымі рысамі твару? Ці гэта чалавек добры і высакародны? Што з'яўляецца больш важным у жыцці і мастацтве — знешняя або ўнутраная прыгажосць?

У кожнай эпохі свой ідэал прыгажосці. Мяняецца час — і мяняецца ідэал. Тое, што лічылася прыгожым у старажытных грэкаў або рымлян, не заўсёды адпавядае ідэалам прыгажосці ў 21 стагоддзі. Дзякуючы творам мастацтва мы даведваемся аб тым, як жылі і што шанавалі нашы продкі.



**П'ер Агюст Рэнуар.**
Партрэт мадэмуазэль Легран

**А. А. Аніке́йчык.** Фантан «Вянок»

Ніка Самафракійская

Давайце параўнаем жаночыя вобразы, якія стварылі французскі мастак П'ер Агю́ст Рэнуа́р і беларускі жывапісец Іван Фаміч Хруцкі. Гераіні адрозніваюцца адна ад адной характарам,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Іван Хруцкі.**
Партрэт жанчыны з кветкамі
і фруктамі

настроем, знешнім выглядам, узростам. Але пры гэтым на абедзвюх карцінах прысутнічае нешта агульнае — ледзь улоўная пяшчота і кранальнасць.

Асаблівае захапленне ў чалавека выклікаюць помнікі архітэктуры. Мы павольна рухаемся вакол Барысаглебскай царквы ў горадзе Гродна. Уважліва ўглядаемся ў розныя дэталі — захапляемся цікавымі фасадамі, каляровай гамай. А вось сляды разбурэнняў...

> «...пан... бачачы Каложскую царкву вельмі разбуранай... перш за ўсё аднавіў разбураныя сцены і зрабіў на царкве дах, а затым і ўнутры ўпрыгожыў дом божы».
>
> *І. Кульчынскі (гісторык)*




Барысаглебская (Каложская) царква (г. Гродна, Беларусь)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Цяпер зойдзем у царкву. Высокія скляпенні, царкоўныя рэчы, спевы, што напаўняюць храм таямнічым гучаннем... Пачуццё духоўнай раўнавагі, светлага суму і спакою выклікае ў нас унутранае харáство храма.

Дык што ж з'яўляецца больш важным у жыцці і ў мастацтве — знешняя або ўнутраная прыгажосць, форма або змест?

**Ф. Шапэ́н.** Прэлюдыя № 4 мі мінор
**В. А. Мо́царт.** Маленькая начная серэнада
**С. В. Рахма́нінаў.** Прэлюдыя рэ мажор

...что есть красота?
И почему её обожествляют люди?
Сосуд она, в котором пустота,
Или огонь, мерцающий в сосуде?

*Н. А. Заболо́цкий*

Кожны Мастак па-свойму дапамагае нам, гледачам і слухачам, адказаць на гэтыя вечныя пытанні. Аўтар дзеліцца сваім вопытам, сваімі пачуццямі і перажываннямі. Ён запрашае нас да разважання пра прыгажосць у жыцці і мастацтве.

### Пытанні і заданні

1. Уважліва разгледзьце творы, прадстаўленыя ў параграфе. Якія з іх уяўляецца вам асабліва прыгожым? Чаму?

2. Угледзьцеся ў творы жывапісу, створаныя П. А. Рэнуарам і І. Ф. Хруцкім. Якія рысы характару гераінь паказаў мастак?

Падбярыце на кампакт-дыску музычныя творы, сугучныя вобразу храма, прадстаўленага ў параграфе.

### Творчая майстэрня

Падбярыце на кампакт-дыску або ў іншых інфармацыйных крыніцах музычныя творы, сугучныя вобразам, створаным П. А. Рэнуарам і А. А. Анікейчыкам. Патлумачце свой выбар.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 5. Пераўтваральная сіла мастацтва

Як правіла, чалавек звязвае мастацтва з прыгажосцю... І гэта не выпадкова!

Навукоўцы займаюцца законамі светабудовы. Рэлігія адказвае на пытанні дабра і маралі. І толькі ў мастацтве на поўную моц праяўляюцца ўяўленні людзей аб прыгажосці. Менавіта прыгажосць мастацкага вобразу прымушае нас, гледачоў і слухачоў, затрымаць сваю ўвагу на творы мастацтва і задумацца. Магчыма, нават крыху памарыць.

**Маста́цкі вобраз** — свет, створаны ўяўленнем мастака.

У сваёй творчасці Мастак выкарыстоўвае ўяўленне, фантазію. Ён не проста апісвае жыццё, не проста паўтарае з'явы і падзеі. Майстар дапаўняе іх, а часам аднаўляе нанава!

Мастацтва свабодна ў выбары тэм і сюжэтаў. Гэта пачуцці чалавека: любоў, шчасце, пакуты. Ці, напрыклад, неіснуючы свет, як у кнізе вядомага пісьменніка-фантаста Жу́ля Ве́рна «Дваццаць тысяч л'е пад вадой». Хіба мог пісьменнік выказаць здагадку, што праз некалькі дзесяцігоддзяў з'явіцца такая ж падводная лодка, як у капітана Нэ́ма?

**У. Пятке́віч.** Анімацыйны фільм «Казкі старога піяніна» (Бетховен)

**Гармо́нія** — гэта сугучча, узгадненне, зладжанасць розных элементаў.

Але ў мастацтве прадстаўлены не толькі прыгожыя вобразы... Як у паўсядзённым жыцці, так і ў мастацтве мы часта сустракаем супрацьлеглыя з'явы. Напрыклад, радаснае і сумнае, камічнае і трагічнае, прыгожае і брыдкае. Але брыдкае ў жыцці не заўсёды

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

роўнае брыдкаму ў мастацтве. «Чаму?» — запытаецеся вы. Давайце ўзгадаем творы, у сюжэтах якіх прысутнічаюць непрыгожыя героі.

Напрыклад, у казцы англійскага пісьменніка Оскара Уайльда «Дзень нараджэння Інфанты» з'яўляецца маленькі карлік.

**О. Уа́йльд.** Казка «Дзень нараджэння Інфанты»

...Карлік быў сапраўды жахлівы, і нават пры іспанскім двары, вядомым сваёй прыхільнасцю да ўсяго брыдкага, такой фантастычнай маленькай пачвары яшчэ не бачылі.

Паступовa мы знаёмімся з Карлікам бліжэй — з яго добрым і чыстым сэрцам, цёплым і трапяткім стаўленнем да ўсяго жывога і перш за ўсё да Інфанты (*ісп. прынцэса*). І мы зусім забываем пра яго непрыгожую знешнасць.

...А вось птушкам Карлік чымсьці спадабаўся. Яны і раней часта бачылі яго ў лесе, як ён танцаваў, падобна да эльфа, ганяўся за лісцем, якое падхапіў вецер, або, скруціўшыся клубочкам дзе-небудзь у дупле старога дуба, дзяліў з белкамі сабраныя арэхі. І іх зусім не хвалявала, што ён такі непрыгожы. Бо і салавей, які па вечарах пеў у апельсінавых гаях так соладка, што нават месяц калі-нікалі схіляўся, каб паслухаць яго, быў і сам не вялікі прыгажун; потым гэты хлопчык быў добры да іх: у жорсткую зімовую сцюжу, калі на дрэвах няма ягад і зямля становіцца цвёрдай, як жалеза, а ваўкі падыходзяць да самых варот горада ў пошуках ежы, ён ніколі не забываў пра іх — заўсёды кідаў ім крошкі ад свайго акрайца чорнага хлеба і дзяліў з імі свой сняданак, якім бы бедным ён ні быў.

І птушкі лёталі і кружыліся вакол яго, дакранаючыся крылцамі да яго шчакі, і шчабяталі між сабою, і маленькі Карлік быў такі шчаслівы, што не мог устрымацца, — пахваліўся перад імі пушыстай белай ружай і сказаў, што гэту ружу падарыла яму сама Інфанта, таму што яна кахае яго...

Стаўленне чытача да Прынцэсы, якая мае прыгожую знешнасць, але жорсткае сэрца, вызначаецца не яе знешнасцю, а ўчынкамі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне





**Таццяна Маўрына.**
Ілюстрацыі да казкі «Царэўна-жабка»

А вось яшчэ адно ператварэнне. Васілісу Прамудрую Кашчэй Несмяротны зачараваў у жабу. Вобраз жабы не выпадковы. Многія майстры мастацтва выкарыстоўвалі яго, каб узмацніць значэнне непрыгожага. Ператварэнне жабы ў царэўну магчыма толькі ў мастацтве. Дзякуючы проціпастаўленню пачварнага і цудоўнага мы, гледачы і слухачы, больш ярка ўяўляем мастацкія вобразы і лепш іх запамінаем.

Мастак — вяшчун. Разумеючы яго, мы таксама становімся паэтамі, як ён.

*А. Франс*

Зноў вярнуўся Іван-царэвіч невясёлы, ніжэй за плечы звесіў галаву. «Ква-ква, Іван-царэвіч! Чаго засмучаны такі? Можа, ад бацькі пачуў слова непрыветлівае?» — «Як мне быць вясёлым? Гасудар мой бацюшка загадаў, каб я з табой на агледзіны прыходзіў: як я цябе людзям пакажу!» — «Не засмучайся, царэвіч! Ідзі адзін да цара ў госці, а я ўслед за табой буду; як пачуеш стук ды гром — скажы: гэта мая жабка ў каробачцы едзе».

Вось старэйшыя браты з’явіліся на агледзіны са сваімі жонкамі, прыбранымі; стаяць ды з Івана-царэвіча смяюцца:

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

«Што ж ты, брат, без жонкі прыйшоў? Хоць бы ў хустачцы прынёс! І дзе ты такую прыгажуню адшукаў? Мабыць, усе балоты абышоў?»

Тут узняўся вялікі стук ды гром — увесь палац задрыжаў; госці моцна спалохаліся, паўскоквалі з месцаў сваіх і не ведаюць, што ім рабіць; а Іван-царэвіч і кажа:

«Не палохайцеся, паны! Гэта мая жабка ў каробачцы прыехала».

Падляцела да царскага ганка пазалочаная брычка, у шэсць коней запрэжаная, і выйшла адтуль Васіліса Прамудрая — такая прыгажуня, што ні падумаць, ні ўзгадаць, толькі ў казцы сказаць!

*Руская народная казка «Царэўна-жабка»*

Мастак — гэта чараўнік! У яго руках вялікая сіла. Мастак запрашае нас радавацца разам з героямі і перажываць за іх лёсы.

## Пытанні і заданні

1. Раскажыце ў класе гісторыю, у якой прысутнічаюць і вясёлыя, і сумныя моманты. Падумайце разам з аднакласнікамі, як гэтую сітуацыю можна адлюстраваць у творы мастацтва.

2. Якія якасці чалавека вы лічыце выдатнымі, а якія — пачварнымі?

## Творчая майстэрня

Паглядзіце на кампакт-дыску фрагмент анімацыйнага фільма У. Пяткевіча «Казкі старога піяніна» (Бетхо́вен). Якія вобразы вы можаце ахарактарызаваць як выдатныя? Чаму?

Азнаёмцеся з літаратурна-музычнай старонкай на кампакт-дыску па тэме «Выдатнае ў мастацтве». Выканайце заданні.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Тэма 4
# Чалавек у мастацтве

Статую ўпрыгожвае выгляд,
а чалавека — яго ўчынкі.
*Піфагор*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Алег Шупля́к.** Аўтапартрэт пад шатамі ліп

## § 6. Пра што расказвае партрэт?



Бюст Неферціці (Старажытны Егіпет)

**Партрэ́т** — выява або апісанне чалавека ці групы людзей.



Імператар Септы́мій Сявéр (Старажытны Рым)

Вобраз чалавека заўсёды прыцягваў Мастака. Дзякуючы магчымасцям мастацтва можна ўбачыць рознага чалавека, зразумець яго характар, настрой, пачуцці...

Першае ўяўленне пра любога чалавека складваецца на аснове яго знешняга выгляду. Пры сустрэчы нават з незнаёмым чалавекам мы можам вызначыць яго ўзрост, пол, рост, асаблівасці целаскладу, колер валасоў і вачэй. Мы звяртаем увагу на манеры, рухі, касцюм... Кожны чалавек індывідуальны. На падставе асаблівых знешніх рыс чалавека, а таксама яго душэўных якасцей мы ствараем ва ўяўленні *партрэтны вобраз*.

Мастак таксама стварае вобраз чалавека. Для гэтага могуць быць выкарыстаны сродкі жывапісу, графікі, скульптуры, фатаграфіі. Адлюстроўваючы людзей, майстар працуе ў жанры *партрэта*. Калі партрэт ствараецца сродкамі жывапісу, то атрымліваецца жывапісны партрэт. Калі сродкамі скульптуры, то скульптурны партрэт... Калі з дапамогай выразных сродкаў літаратуры, то ў гэтым выпадку вынікам працы Мастака становіцца літаратурны партрэт.

Аднак задача Мастака — не проста стварыць добрую копію аблічча чалавека. Мастак імкнецца паказаць яго ўнутраны свет, раскрыць характар, перадаць настрой. Пры гэтым, працуючы над партрэтам, Мастак адлюстроўвае тое, што лічыць

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

самым важным, галоўным у мадэлі. Глядач жа па выразе вачэй, павароце галавы разгадвае гэты вобраз і спрабуе зразумець, як чалавек ставіцца да жыцця, да іншых людзей, да сябе.



**Пе́трус Кры́стус.**
Партрэт дзяўчыны

У розныя гістарычныя эпохі ў партрэтах людзей адлюстроўваліся рысы, уласцівыя пэўнаму часу. Таму перададзеныя ў творах мастацтва вобразы людзей мінулых эпох — гэта гісторыя, якая «ажыла».

Напрыклад, у мастацтве першабытных часоў адлюстраванне чалавека было, як правіла, звязана з тэмай палявання.



**Пітэр Паўэл Рубенс.**
Эцюд галавы дзяўчынкі

У мастацтве старажытных цывілізацый, Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма ўяўленні пра чалавека пашыраюцца. Мастакі больш падрабязна працуюць над фігурай, паставай, рысамі асобы, элементамі касцюма. Партрэт царыцы Неферціці напісаны тры з паловай тысячы гадоў таму. У ім скульптар змог перадаць мяккасць, жаноцкасць і адначасова адухоўленасць маладой жанчыны. Невялікая галава і гнуткая шыя поўныя вытанчанасці. У куточках рота стаілася ўсмешка.

Пазней Мастакі пачалі надаваць больш увагі дэталям: выразу твару, мiмiцы. Аднак найвялікшы росквіт мастацтва партрэта прыпадае на 17–18 стагоддзі. Менавіта ў гэты час у партрэце ярка праяўляюцца ўнутраны свет чалавека, яго пачуцці і перажыванні.

У партрэце дзяўчынкі, якая, магчыма, даводзіцца мастаку дачкой, фламандскі жывапісец Пі́тэр Па́ўэл Ру́бенс перадаў яе жыццярадаснасць і гуллівасць. Гарэзлівы погляд, лёгкая ўсмешка, румянец

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Рэмбрант.**
Партрэт старога
ў чырвоным

на шчочках адлюстроўваюць шчырасць і непасрэднасць дзіцяці. Залацістыя пасмы валасоў, якія звісаюць з акуратна сабранай прычоскі, выдаюць гуллівы характар дзяўчынкі.

Спакой, унутраную засяроджанасць і сум перадаў у «Партрэце старога ў чырвоным» галандскі мастак 17 стагоддзя Рэ́мбрант. Стомлены ад зямных клопатаў стары паглыблены ў свой унутраны свет. Яго погляд, звернуты ў бясконцасць, поўны ўспамінаў аб пражытых гадах. Складзеныя на каленях рукі, якія не ведалі адпачынку і спакою, паказваюць на працавітасць старога. Сведкі падзей доўгага жыцця — глыбокія маршчыны на твары — падкрэсліваюць мудрасць, якая прыйшла з вопытам.

Асаблівую цікавасць уяўляюць партрэты аднаго і таго ж чалавека ў розныя перыяды жыцця. Іспанскі мастак Дыега Вела́скес стварыў



**Дыега Веласкес.**
Партрэт інфанты Маргарыты
(3 гады)



**Дыега Веласкес.**
Партрэт інфанты Маргарыты
(5 гадоў)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

жанр партрэтаў-біяграфій. Малюючы розных асоб на працягу некалькіх гадоў, Мастак не толькі падкрэсліваў змены ў вонкавым абліччы людзей, але і прыкмячаў унутраныя перамены, якія адбываюцца з імі. Адной з любімых мадэляў Веласкеса была юная прынцэса Маргарыта.

Разнавіднасцю партрэта з'яўляецца *аўтапартрэт*, гэта значыць партрэт, на якім Мастак выяўляе самога сябе. У такіх працах часта выкарыстоўваюцца адмысловыя знакі і атрыбуты мастацтва: палітра з фарбамі, пэндзлі, мальберт…



**Марк Шага́л.**
Аўтапартрэт каля мальберта

Працуючы ў жанры партрэта, Мастак імкнецца не толькі захаваць для гісторыі рысы той ці іншай асобы, але і паказаць унутраны свет чалавека, яго характар, пачуцці і думкі.

### Пытанні і заданні

1. Разгледзьце партрэты ў параграфе. Звярніце ўвагу на касцюм, упрыгажэнні, прычоскі герояў. Як яны змяняюцца ў розныя эпохі?

2. Прыгледзьцеся да партрэтаў інфанты Маргарыты мастака Дыега Веласкеса. Чым адрозніваюцца партрэтныя выявы? Патлумачце свой адказ.

### Творчая майстэрня

3. Складзіце моўны партрэт чалавека, які вам цікавы (5–6 сказаў).

4. Сфатаграфуйце свайго аднакласніка. Прыдумайце фотапартрэту арыгінальную назву. Раскажыце, што вы хацелі паказаць у партрэце і што ў вас атрымалася.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 7. Чалавек на фоне гісторыі



**Васіль Сурыкаў.**
Пераход Суворава праз Альпы



**Аляксандр Рослін.**
Партрэт Кацярыны II

Гісторыя любой дзяржавы — гэта чарада падзей, якія адбываюцца з удзелам чалавека. Кожны чалавек мае дачыненне да гісторыі. Ад таго, якія ўчынкі ён здзяйсняе, залежыць і яго роля ў гісторыі.

Гістарычныя асобы становяцца героямі літаратурных твораў, тэатральных пастановак, кіно. Ім прысвечаны творы выяўленчага мастацтва і музыкі.

На палатне рускага мастака Васіля Іванавіча Су́рыкава «Пераход Суворава праз Альпы» мы бачым знакамітага палкаводца і яго адважных салдат. На першым плане карціны — простыя воіны, якія апынуліся ў складаных і нязвыклых для іх умовах высакагор'я. Самаадданa пераадольваючы снежныя лавіны ў гарах Швейцарыі, А. В. Сувораў вядзе за сабой войска на рашучую бітву. Ён упэўнены ў перамозе арміі ў бітве, якая хутка адбудзецца.

А цяпер пазнаёмімся з рускай імператрыцай Кацярынай II. Яе самы вядомы партрэт створаны шведскім мастаком Аляксандрам Росліным. На партрэце імператрыца адлюстравана ў палацавым інтэр'еры на фоне велічных калон і раскошных аксамітных драпіровак. Кацярына II паказана ў поўны рост. Яе пышнае адзенне, сатканае з залатых і сярэбраных нітак, пераліваецца зіхатлівымі блікамі. Дапаўняе касцюм пурпурная мантыя, падбітая гарнастаем. У правай руцэ імператрыца сціскае скіпетр — адзін з сімвалаў дзяржаўнай улады. Справа ад яе на чырвонай аксамітнай

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

падушцы выяўлены іншыя сімвалы ўлады — дзяржава і вялікая імператарская карона.

**З. І. А́згур.** Партрэт Рабіндрана́та Таго́ра

**В. І. Бавэ́.** Маскоўская Трыумфальная брама

**Л. ван Бетхо́вен.** Уверцюра «Карыялан»



**Эцьен Марыс Фальканэ.** Медны коннік (г. Санкт-Пецярбург, Расія)

Па заказе Кацярыны II французскі скульптар Эцьен Марыс Фальканэ стварыў арыгінальны партрэтны вобраз імператара Пятра I. Назва «Медны коннік» помнік скульптуры атрымаў дзякуючы аднайменнай паэме А. С. Пушкіна. У адрозненне ад большасці партрэтаў імператараў, створаных у 18 стагоддзі, Э. М. Фальканэ адлюстроўвае цара ў свабоднай вопратцы, якая нагадвае і старажытнарымскі, і традыцыйны рускі касцюмы. Скульптар засяродзіў увагу на постаці Пятра I у сядле ўзнятага на дыбкі каня, які стаіць на вяршыні скалы. Упэўненая, гордая пастава імператара адлюстроўвае царскую волю, магутнасць, рашучасць.

Сілу духу, стойкасць і мужнасць беларускага народа па-майстэрску перадаў скульптар Сяргей Іванавіч Селіха́наў у мануменце «Нескароны чалавек» мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Аўтар манумента перадаў трагізм бацькі, які трымае на руках загінуўшага сына.



**Сяргей Селіханаў.** Нескароны чалавек

Уварваўшыся ў вёску, фашысцкія захопнікі сагналі ўсіх жыхароў у гумно і падпалілі яго. У агні зажыва згарэлі мірныя людзі. Ацалелі толькі некалькі чалавек: дзве маладыя дзяўчыны, два хлопчыкі і адзін

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

мужчына — каваль Іосіф Камінскі. Менавіта яго вобраз застаўся ў бронзе на стагоддзі як сімвал непераможнасці і адвагі чалавека перад жорсткасцю вайны.

Кіраўнікі дзяржаў, палкаводцы, рэфарматары, дзеячы культуры і мастацтва... Мастакі часта прысвячаюць ім свае шматлікія творы. А мы дзякуючы майстрам мастацтва можам лепш даведацца пра гісторыю, у тым ліку свайго роднага краю.

### Пытанні і заданні

1. Падзяліцеся сваімі ўражаннямі ад прагляду гістарычных партрэтаў, прадстаўленых у параграфе. Які эмацыянальны стан перададзены майстрамі мастацтваў?

2. Разгледзьце скульптуру «Нескароны чалавек». Як вы думаеце, чаму скульптар даў помніку менавіта такую назву?

### Творчая майстэрня

Падбярыце на кампакт-дыску або ў іншых інфармацыйных крыніцах да партрэтаў гістарычных асоб, прадстаўленых у параграфе, музычныя творы, сугучныя іх зместу і настрою.

## § 8. Чалавек і праца

Праца ўпрыгожвае чалавека. Чалавек, які якасна выконвае працу, заслугоўвае павагі і пашаны. Адказны чалавек творыць дабро. Бо ад таго, як будзе зроблена яго праца, залежаць лёсы іншых людзей.

Тэма працы ў мастацтве цесна звязана з выявай людзей розных прафесій. Але мастак не проста паказвае нам чалавека працы, ён надае ўвагу пэўным абставінам і прыладам працы. А вось партрэтныя рысы чалавека — асоба, міміка — сыходзяць на другі план.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Гюстаў Курбэ.**
Драбільшчыкі камянёў

Французскі мастак Гюста́ў Курбэ́ ў карціне «Драбільшчыкі камянёў» адлюстраваў рабочых асаблівым чынам. Ён наўмысна не паказаў іх твары, каб прыцягнуць увагу гледачоў да цяжкой працы каменачосаў. У цэнтры ўвагі мастака — дзве фігуры. Гэта стары і юнак, якія здабываюць каменне для будаўнічых работ. Яны паказаны буйным планам, у падранай вопратцы. Іх мускулістыя рукі і загарэлая скура сведчаць пра тое, што мужчыны ўжо доўгі час працуюць пад пякучым сонцам, не шкадуючы сіл. Стары, які сагнуўся, замахваецца малатком, падрыхтаваўшыся зрабіць удар па гары камянёў. Малады мужчына нясе кошык са шчэбенем.

Карціна «Зборшчыцы каласоў» французскага мастака Жа́на Франсуа́ Міле́ прысвечана сельскім працаўнікам. Тры сялянкі, схіліўшыся над прыбраным полем, збіраюць пакінутыя каласкі. Ад колькасці сабраных каласоў залежыць, ці хопіць іх сем’ям хлеба да новага ўраджаю або іх чакае галодны год.



**Жан Франсуа Міле.**
Зборшчыцы каласоў

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Міхаіл Сеўрук.**
Жніво

Мастак не выпадкова абраў такія складаныя павароты фігур — мы не бачым твараў жанчын, але добра адчуваем увесь цяжар іх працы. Сялянкі паказаны буйным планам на фоне сельскага пейзажу. Недзе ўдалечыні, сярод стагоў, — жняцы, якія адпраўляюць павозку з багатым ураджаем. Іх праца таксама важная, але яна не такая цяжкая.

А вось перад намі карціна-аповед мастака Міхаіла Канстанцінавіча Се́ўрука «Жніво». Сярод залітых сонцам палёў жняцы ўбіраюць жыта. Мужчына і жанчына збіраюць яго ў снапы. Крыху далей — двое мужчын паспешліва вязуць на павозцы сабраны ўраджай.  У цэнтры карціны — маці, якая корміць немаўля. Тут жа, пад шатамі велічных дубоў, адпачываюць касцы. Малы забаўляецца з сабакам. Усе захоплены сваёй справай. Праца на радасць...

**Ілья Рэпін.**
Хірург Паўлаў у аперацыйнай зале



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Прафесіі ўрача прысвечана карціна рускага мастака Ільí Яфíмавіча Рэ́піна «Хірург Паўлаў у аперацыйнай зале». Урачы абмяркоўваюць аперацыю, якую правядуць у хуткім часе. На тварах прыкметна напружанне, у жэстах адчуваецца ўпэўненасць і рашучасць. І гэта зразумела: іх задача — выратаваць жыццё чалавека!

Мастакі ў сваёй творчасці падрабязна расказваюць нам пра жыццё чалавека. Мы даведваемся пра яго майстэрства, таленты, прафесійныя якасці.

### Пытанні і заданні

1. Уважліва разгледзьце ўсе мастацкія творы, прадстаўленыя ў параграфе. Якія пачуцці яны выклікаюць у вас? Чаму?

2. Вы пазнаёміліся з творамі мастацтва, у якіх паказана, чым займаюцца людзі розных прафесій. А якая прафесія цікавая вам? Раскажыце пра яе.

### Творчая майстэрня

3. Складзіце моўны партрэт чалавека той прафесіі, якая вас цікавіць.

## § 9. Вобраз чалавека: рэальны і фантастычны

Людзі доўгі час не маглі растлумачыць многія з’явы прыроды: адкуль з’яўляецца агонь, хто стварыў горы, чаму вясну змяняе лета... Жадаючы разабрацца ў пытаннях светабудовы, яны складалі міфы і легенды. Ва ўяўленнях чалавека старажытнага свету ўсім незвычайным кіравалі фантастычныя істоты, у чымсьці падобныя на чалавека. Гэтыя істоты валодалі асаблівай сілай, маглі быць гіганцкага росту або зусім маленькімі, мець хвост або крылы. Менавіта гэтыя адрозненні дапамагалі выдуманым істотам рабіць тое, што чалавеку не пад сілу.

**Фальклóр** — вусная народная творчасць.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Андрэй Шышкін.**
Каляда

Прыйшоў час, і чалавек знайшоў навуковае тлумачэнне таго, што адбываецца на Зямлі. Але выдуманыя вобразы, падобныя на чалавека, засталіся жыць у творах мастацтва.

У фальклоры славян адным з ушанаваных вобразаў з'яўляецца Каляда. Па народных павер'ях, Каляда — гэта бажаство, якое падаравала людзям веды, у тым ліку каляндар. Славяне ўяўлялі Каляду ў вобразе маладога бога Сонца. На карціне сучаснага мастака Андрэя Аляксеевіча Шы́шкіна «Каляда» бог Сонца паўстае ў аблічччы чалавека.

Адным з фальклорных вобразаў скандынаўскіх народаў, з якім звязана мноства легенд, з'яўляецца гном. Згодна з павер'ямі, жыхары падзямелля — гномы — карлікавага росту, носяць бароды, працавітыя і цягавітыя. Гномы славяцца майстэрствам здабываць і апрацоўваць металы і камяні. Іх атрыбутамі з'яўляюцца сякера і матыка. Гномы вырабляюць зброю, ствараюць цудоўныя ўпрыгажэнні з каштоўных камянёў.

Вобраз спрытнага, моцнага і вернага гнома прыцягвае мастакоў і сёння. Пацвярджэннем гэтага з'яўляюцца жывапісныя палотны, мультыплікацыйныя і мастацкія фільмы, камп'ютарныя гульні.

Уладальніца горных скарбаў — Гаспадыня Меднай горы — персанаж рускага фальклору. Яна з'яўляецца нам то ў вобразе яшчаркі



**Ге́нрых Шліт.**
Гном

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Аляксандр Птушко.**
Кадр з фільма-казкі «Каменная кветка»
(Масфільм)

з каронай на галаве, то паўстае выдатнай дзевай у сукенцы з малахіту, з доўгімі косамі, у якія ўплецены медныя стужкі. Прагным і скупым людзям яна прадказвае няўдачу, а добрым, сумленным і сціплым дорыць багацце.

Вобраз Гаспадыні Меднай гары стварыў рускі пісьменнік Павел Пятровіч Бажóў. Шырокую вядомасць сказ набыў дзякуючы фільму «Каменная кветка» рэжысёра Аляксандра Лукічá Птушкó.

Толькі раптам цёпла стала, нібы лета вярнулася. Данілушка падняў галаву, а насупраць, каля другой сцяны, сядзіць Меднай гары Гаспадыня. Па прыгажосці ды па сукенцы малахітавай Данілушка адразу яе пазнаў. Толькі і то думае:

«Можа, мне гэта здаецца, а на справе нікога няма».

Сядзіць — маўчыць, глядзіць на тое месца, дзе Гаспадыня, і быццам нічога не бачыць. Яна таксама маўчыць, быццам бы прызадумалася. Потым і пытаецца:

— Ну, што, Даніла-майстар, не атрымалася твая дурман-чаша?

— Не атрымалася, — адказвае.

— А ты не вешай галаву! Іншае паспрабуй. Камень табе будзе, па тваіх думках.

— Не, — адказвае, — не магу болей. Замучыўся ўвесь, не атрымліваецца. Пакажы каменную кветку.

Звяры, насякомыя, рыбы, якія валодаюць чалавечай мовай, сустракаюцца нам у казках і мультыплікацыйных фільмах. Розныя чалавечыя якасці праяўляюцца ў галоўнай героіні мультфільма «Прыгоды рэактыўнага парасяці» беларускага рэжысёра Аляксандра

Правообладатель Адукацыя і выхаванне





Кадры з мультфільма «Прыгоды рэактыўнага парасяці» А. Ленкіна (Беларусьфільм)

Адольфавіча Ле́нкіна. На працягу ўсяго фільма галоўная гераіня імкнецца спазнаць розныя сферы дзейнасці чалавека.

Аўтар фільма хацеў, каб мультфільм быў зразумелы ўсім людзям. Таму што самая ўніверсальная мова — гэта мова пачуццяў і эмоцый.

**А. Ленкін.** Анімацыйны фільм «Прыгоды рэактыўнага парасяці»

Дзякуючы творам мастацтва людзі мінулага, сучаснасці і нават будучыні адкрываюцца нам, становяцца больш блізкімі і цікавымі...

### Пытанні і заданні

1. Якія казачныя вобразы вам вядомыя? Назавіце іх.

2. Якія вобразы беларускага фальклору, надзеленыя характэрнымі рысамі чалавека, вы ведаеце? Які з іх вам падабаецца? Чаму?

3. У якіх творах мастацтва галоўным персанажам з'яўляецца лялька? Падумайце і назавіце некалькі твораў розных відаў мастацтва.

### Творчая майстэрня

4. Прыдумайце фантастычны персанаж, падобны на чалавека. Выканайце эскізны малюнак гэтага персанажа.

Азнаёмцеся на кампакт-дыску з музычнай старонкай па тэме «Чалавек у мастацтве». Выканайце заданні.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Тэма 5

# Свет прыроды ў мастацтве

Нават у найпрыгажэйшых сваіх марах чалавек не можа ўявіць нічога больш цудоўнага за прыроду.

*А. Ламарці́н*



**Валяр’я́на Жо́лтак.** Званочкі лясныя

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 10. Свет прыроды ў мастацтве – глядзім і слухаем



**Казімі́р Альхімо́віч.**
Пейзаж з буслам
(фрагмент)

Са старажытных часоў прыродны свет выконвае важную ролю ў жыцці чалавека. З прыродных матэрыялаў: дрэва, каменя, раслін — чалавек стварае ўсё неабходнае. Менавіта прырода дае чалавеку дом, ежу, адзенне.

Чалавек вучыцца ў прыроды, як правільна жыць. Ён уладкоўвае жыллё, вынаходзіць складаныя механізмы і прадметы, абапіраючыся на тыя веды, якія дае яму прырода. Ідэі многіх найвялікшых тварэнняў чалавека «падгледжаны» ў прыродным свеце — свеце складаным, багатым і на дзіва шчодрым.

У той жа час прырода можа быць небяспечнай для чалавека. Узгадаем такія грозныя стыхіі, як шторм, цунамі, вывяржэнне вулканаў, землетрасенне. І тым не менш, абараняючыся ад прыродных стыхій, чалавек усё роўна працягвае захапляцца прыродай. Багаты і разнастайны ў сваіх праявах прыродны свет з'яўляецца для чалавека ўзорам дасканаласці і прыгажосці.

**Пейза́ж** — жанр у мастацтве, прысвечаны адлюстраванню прыроды.

Веліч і зачараванасць прыродай ва ўсе часы імкнуліся захаваць у сваіх творах мастакі і скульптары, паэты і пісьменнікі, кампазітары і дойліды. Малюючы свет прыроды, майстры мастацтваў увасаблялі ў творах свае ўражанні, эмоцыі і перажыванні. Прыгажосць і разнастайнасць фарбаў зямлі, бязмежных палёў і лясоў, глыбіня азёр і рэк, бяздоннасць мора і неба перадаюцца ў творах мастацтва заўсёды па-рознаму. І перад намі — гледачамі, слухачамі, чытачамі — узнікаюць разнастайныя вобразы. Светлыя, таямнічыя, маўклівыя, далікатныя, загадкавыя...

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Іван Шышкін.**
Карабельны гай

Адлюстраванню прыроды прысвяціў сваё жыццё рускі мастак Іван Іванавіч Шышкін. На яго карціне «Карабельны гай» тонка і выразна прамаляваны галіны і кроны магутных соснаў, патрэсканая кара іх ствалоў, парослыя мохам берагі ручая з чыстай празрыстай вадой, векавыя камяні на пясчанай водмелі, азораны сонцам узлесак. Гульня святла і ценю, цёплыя тоны — і перад намі ажывае карціна лета ў сасновым лесе. А цяпер паспрабуем прыслухацца да гэтай карціны: мяккае цурчанне ручая, лёгкі шэпт стомленых ад спёкі дрэў, глыбокія ўздыхі векавых камянёў...

Іншая карціна прыроды паказана ў працы мастака Вінсэнта Ван Гога «Квітнеючыя галінкі міндаля». У адрозненне ад летніх фарбаў І. І. Шышкіна тут жывапісец стварае яркі вясновы каларыт. Асаблівую ўвагу ён надае каляровай гаме. Халодныя адценні і падрабязная прамалёўка кветак міндаля даюць гледачу адчуванне, што ён назірае за тым, як ажывае вясной прырода. І зноў прыслухаемся да карціны. Амаль празрыстае паветра, лёгкае пакалыхванне галінак, ласкавае трапятанне кветак міндальнага дрэва выклікаюць у нас прыемныя адчуванні вясновай свежасці і радасці жыцця.



**Вінсэнт Ван Гог.**
Квітнеючыя галінкі міндаля

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Дзякуючы мастацтву мы можам па-новаму ўбачыць свет прыроды. Здзівіцца прыгажосці таго, што ўчора здавалася звыклым і будзённым.

### Пытанні і заданні

1. Уважліва разгледзьце рэпрадукцыі трох пейзажаў: К. Д. Альхімовіча, І. І. Шышкіна і В. Ван Гога. Што, на ваш погляд, з'яўляецца самым важным у адлюстраванні прыроды? Прыдумайце свае назвы пейзажам гэтых мастакоў.

### Творчая майстэрня

2. Выканайце малюнак на тэму «Свет прыроды за акном».

3. Складзіце вуснае апавяданне пра незвычайныя гукі навакольнага свету (музыка дажджу, шолах лістоты і інш.).

## § 11. Які настрой у прыроды?

Чатыры асноўныя прыродныя стыхіі — *вада, паветра, зямля* і *агонь* — пачатак усяго жывога на планеце. Усе яны аднолькава прывабныя для мастакоў, аднолькава часта вобразы кожнай са стыхій увасоблены ў творах мастацтва.

Рускі мастак Іван Канстанцінавіч Айвазоўскі ўсё сваё жыццё прысвяціў стварэнню марскіх пейзажаў. І мора ў яго заўсёды роз-



**Іван Айвазоўскі.**
Марскі бераг. Развітанне

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

нае. Кожная яго карціна — гэта пэўны настрой і стан марской стыхіі.

На карціне «Марскі бераг. Развітанне» мы бачым раніцу, штыль, павольнае развітанне сям'і і шлюпку, якая чакае вандроўніка. Крыху далей — сілуэт двухмачтавага судна. Спакойная роўнядзь мора абяцае шчаслівае плаванне. Цішыня і спакой...

**Мары́на** — гэта малюнак мора.

А вось карціна «Чорнае мора». Тут дакладна перададзена атмасфера буры, якая вось-вось пачнецца, рух хваль. З кожнай новай хваляй з'яўляецца жаданне схавацца. Мора амаль зліваецца з небам — і дзесьці вельмі далёка губляецца ледзь улоўны сілуэт карабля.

**І. К. Айвазоўскі.** Чорнае мора

**М. А. Рымскі-Корсакаў.** Сюіта «Шахеразада»
**С. В. Рахманінаў.** Прэлюдыя соль-дыез мінор

Вобраз мора ўзнікае ва ўяўленні пры праслухоўванні сімфанічнай сюіты Мікалая Андрэевіча Рымскага-Корсакава «Шахераза́да». Гэтак жа, як і на карцінах І. К. Айвазоўскага, у музычным творы адноўлены настрой марской стыхіі.

Слухаючы першую частку сюіты «Мора і Сіндбадаў карабель», мы ўяўляем спакойнае мора. Мірна перакатваюцца хвалі, а на хвалях мерна пакалыхваецца ў чаканні новых прыгод карабель. Зусім іншы настрой мора ў чацвёртай частцы сюіты — «Свята ў Багдадзе». У музыцы чуюцца трывожныя ноткі, якія абвяшчаюць трагедыю. Карабель нясецца ў моры, нястрымна набліжаючыся да сваёй гібелі. Паруснік разбіваецца аб скалы.



**Клод Манэ.**
Гарлачыкі

Французскі мастак Клод Манэ на карціне «Гарлачыкі» намаляваў сажалку сваёй сядзібы. Вясёлкавыя плямы трапяткіх вадзяных кветак ажыўляюць карці-

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ну. Ствараецца ўражанне, што сажалка дзякуючы іскрыстым фарбам гарлачыкаў нібы расцвітае. Дрэвы і неба, адлюстраваныя ў вадзе, толькі адцяняюць іх яркасць і свежасць, ствараючы радасны, узнёслы настрой.

Захапленне роднай прыродай перадаў беларускі мастак Павел Васілевіч Ма́сленікаў у карціне «Азёрны край». Перад намі — бяскрайняя прастора азёр, акружаная багатай прыгожай расліннасцю. Нізкая лінія гарызонту кліча ўдалечыню. Дзесьці там шапка лесу хавае ад нас свае тайны. Спераду раскінулася возера. Лёгкая рабізна на вадзе адлюстроўвае мудрагелістыя формы воблакаў. Свежы ветрык цёплым павевам ахутвае дрэвы каля берагоў вадаёма. Іх лісце, што гарыць яркімі фарбамі, перадае кожнай травінцы на лузе сум адыходзячага лета.

Прыгажосць рускай прыроды апеў у сваёй творчасці кампазітар Сяргей Васільевіч Рахма́нінаў. Усхваляванасць і ў той жа час спакой, празрыстасць і далікатнасць адчуваюцца ў гуках прэлюдыі сольдыез мінор. Слухаючы музыку, мы нібы бачым дарагія кампазітару карціны рускага пейзажу: бязмежныя стэпы, задумлівыя лясы і шырокія рэкі. «Што такое музыка? Гэта ціхая месячная ноч. Гэта шолах жывой лістоты. Гэта аддалены вячэрні звон. Гэта тое, што нараджаецца ад сэрца і ідзе да сэрца», — так адказаў С. В. Рахманінаў на гэтае пытанне, знаходзячыся далёка за межамі сваёй радзімы і сумуючы па ёй.



**Павел Масленікаў.**
Азёрны край

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

І Клод Манэ, і Павел Масленікаў, і Сяргей Рахманінаў у сваёй творчасці апявалі прыгажосць і непаўторнасць роднага краю, ганарыліся ім і адначасова перажывалі за яго лёс.

### Пытанні і заданні

Разгледзьце рэпрадукцыі карцін І. К. Айвазоўскага. Праслухайце на кампакт-дыску сімфанічную сюіту М. А. Рымскага-Корсакава «Шахеразада». Параўнайце вобразы мора на карцінах І. К. Айвазоўскага і ў музыцы М. А. Рымскага-Корсакава. Чым падобныя і чым адрозніваюцца вобразы марской стыхіі ў розных аўтараў?

Праслухайце на кампакт-дыску Прэлюдыю соль-дыез мінор С. В. Рахманінава. Якое ўражанне на вас зрабіла музыка?

### Творчая майстэрня

1. Успомніце сваё любімае месца адпачынку на прыродзе. Выканайце пейзаж «Настрой прыроды». Пастарайцеся перадаць у працы сваё стаўленне да любімага куточка.

## § 12. Які ў прыроды характар?

Які ў прыроды характар? Чаму мы часта кажам пра прыроду нібы пра нешта адушаўлёнае? Ці знаёмыя вам выразы «дождж плача», «сонца ўсміхаецца», «лісце шапоча», «вецер вые», «снег рыпіць»? Магчыма, прыродны свет сапраўды жывы і ў яго ёсць свой характар?



**Ісак Левітан.**
Залатая восень

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Леанід Шчамялёў.**
Восень пад Мінскам

Паспрабуем правесці яго даследаванне, надаўшы ўвагу адной пары года — *восені*.

Восень... Якая яна? Залатая, яркая, вясёлая? Або ціхая, сумная, дажджлівая? Восень — розная... І мастакі імкнуцца прыкмеціць і захаваць яе фарбы. Давайце разам разгледзім працы жывапісцаў на восеньскую тэматыку і паразважаем аб характары восені. На карціне мастака Ісака Ільіча Левіта́на «Залатая восень» мы бачым аблашчаную восеньскім сонцам прыроду: кроны нераўнамерна пажоўклых дрэў, раку, у якой адлюстроўваецца па-асенняму яркае неба, лёгкія святочныя аблокі.

Беларускі мастак Леанід Дзмітрыевіч Шчамялёў па-свойму бачыць восень і перадае яе характар у творы «Восень пад Мінскам» яркімі фарбамі, нанесенымі густымі мазкамі. Два восеньскія пейзажы, і два цалкам розныя характары восені.

У вершы «Восень» расійскай паэтэсы Галіны Сяргееўны Га́мпер галоўным персанажам з'яўляецца клён. Клён параўноўваецца з клоўнам, які зайшоў у госці да чалавека і выратаваў яго ад восеньскай тугі. Паглядзіць чалавек на вясёлага рудага блазна — і яму будзе ўжо не так сумна.

**Осень**

На лесные продрогшие склоны,
Презирая дожди и слякоть,
Вышел клён, вышел рыжий клоун
В самый раз, когда надо плакать.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Он так ловко от солнца зажмурился,
Притворился таким повесой.
Неудобно нам стало хмуриться
Или просто сделалось весело?

Он прошёл колесом оранжевым,
Он нам листья швырнул на счастье.
И не поняли мы ни разу,
Что ведь вышел-то он прощаться.

Разнастайныя восеньскія настроі прадстаўлены ў фартэпіянных п'есах з цыкла Пятра Ільіча Чайкóўскага «Поры года». Цыкл складаецца з дванаццаці фартэпіянных п'ес, кожная з якіх прысвечана аднаму месяцу. Часта фартэпіянны цыкл «Поры года» П. І. Чайкоўскага называюць «энцыклапедыяй пейзажу». У п'есах тонка паказаны прыгажосць прыроды, жыццё рускіх людзей з іх звычаямі, традыцыямі, святамі. Давайце праслухаем тры п'есы, прысвечаныя восені, — «Верасень. паляванне» («Сентябрь. Охота»), «Кастрычнік. Восеньская песня» («Октябрь. Осеняя песнь») і «Лістапад. На тройцы» («Ноябрь. На тройке»). Кожнай з гэтых п'ес адпавядаюць эпіграфы — паэтычныя радкі з вершаў рускіх паэтаў. Гэтыя эпіграфы дапамагаюць нам, слухачам, улавіць тонкія адценні настрою музычнага пейзажу.

**Сентябрь. Охота**

Пора, пора! Рога трубят:
Псари в охотничьих уборах
Чем свет уж на конях сидят;
Борзые прыгают на сворах.

*А. С. Пушкин*

**Октябрь. Осенняя песнь**

Осень, осыпается
весь наш бедный сад,
Листья пожелтевшие
по ветру летят...

*А. К. Толстой*

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Ноябрь. На тройке**

Не гляди же с тоской на дорогу
И за тройкой вослед не спеши
И тоскливую в сердце тревогу
Поскорей навсегда заглуши.

*Н. А. Некрасов*

**Алего́рыя** — гэта іншасказанне, паказ нейкай з'явы праз іншы вобраз.

**П. І. Чайкоўскі.** Цыкл «Поры года» («Кастрычнік. Восеньская песня»)

**Э. М. Фальканэ.** Зіма
**П. Барата.** Алегорыя зімы



**П'етра Барата.**
Алегорыя восені (Вакх)
(г. Санкт-Пецярбург, Расія)

У скульптуры прыродны свет паказаць больш складана. Як перадаць настрой і характар прыроды з дапамогай каменя, дрэва, бронзы? Майстры прапанавалі выразны прыём — алегорыю. Яркім прыкладам алегорыі з'яўляецца скульптурная кампазіцыя П'е́тра Бара́ты «Алегорыя восені (Вакх)». Восень тут паказана ў вобразе юнака — бога ўрадлівасці і вінаробства Вакха. Ён шчодра ўпрыгожаны сакавітымі вінаграднымі гронкамі. Лісце і ягады ўтвараюць вянок на галаве юнака, спускаюцца з плячэй, ствараючы ўражанне бясконцай стужкі восеньскіх дароў.

Пасля восені нязменна прыходзіць зіма. І закруціўся, закруціўся кругаварот прыроды! Вясновае абуджэнне, яркія летнія фарбы, і зноў восеньскае завяданне... Але кожны перыяд — гэта новы настрой прыроды. Разгадаць і захаваць гэтыя настроі ў сваіх творах імкнуцца многія мастакі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Пытанні і заданні

1. Падбярыце як мага больш слоў-эпітэтаў, якія характарызуюць настрой і характар вясны, лета, восені, зімы.

Уважліва разгледзьце скульптуры П. Бараты «Алегорыя восені (Вакх)» і «Алегорыя зімы» на кампакт-дыску. Чаму настрой і характар прыроды складана перадаваць сродкамі скульптуры? Якія прыёмы выкарыстоўвае скульптар для перадачы вобраза зімы?

### Творчая майстэрня

2. Выканайце малюнак «Восень у маім горадзе (пасёлку)». Перадайце настрой восеньскай прыроды.

## § 13. Як адлюстроўвае прыроду мастак?

Імкненне перадаць прыгажосць прыроды ўласціва многім мастакам. Рускі пісьменнік Міхаіл Міхайлавіч Прышвін заўважыў: «Для іншых прырода — гэта дровы, вугаль, руда або дача. Для мяне прырода — гэта асяроддзе, з якога, як кветкі, вырастаюць усе нашы чалавечыя таленты». Ствараючы мастацкія творы, майстры мастацтва імкнуцца перадаць нам сваё захапленне прыродай.

Свет прыроды знаходзіць увасабленне не толькі ў жанры пейзажу. Для многіх мастакоў любімым жанрам з'яўляецца нацюрморт. У нацюрмортах мастакі адлюстроўваюць самыя розныя прадметы — кветкі, плады, прыгожы посуд. Часам уключаюць у кампазіцыю выявы жывёл.

Напрыклад, карціна беларускага мастака Івана Фаміча Хруцкага «Нацюрморт з птушачкай» захапляе багаццем праяў прыроды, сабраных у адной кампазіцыі. Ствараючы нацюрморты, мастак імкнуўся дапоўніць іх незвычайным элементам. На гэтай карціне мы бачым невялікую птушачку, якая ажыўляе агульны настрой.



**Іван Хруцкі.**
Нацюрморт з птушачкай

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У іншай манеры выкананы нацюрморт Поля Сеза́на «Персікі і грушы». Грушы, злёгку нахіленая талерка з персікамі, збан для малака, змяты абрус перададзены некалькі спрошчана. Гэта дазваляе адчуць не толькі выгляд прадметаў, але і разнастайнасць іх адценняў. Часта нацюрморты П. Сезана, І. Ф. Хруцкага і многіх іншых мастакоў перадаюць менавіта адушаўлёнасць прыроды, якая дорыць сябе чалавеку.

**Нацюрмо́рт** — гэта выява неадухоўленых прадметаў мастацтва.

Народныя ўмельцы выкарыстоўваюць асаблівыя мастацкія прыёмы. Яркія фарбы і мудрагелістыя ўзоры, якія нагадваюць прыродныя формы, упрыгожваюць куфары і куфэрачкі, народныя касцюмы і ручнікі, посуд і самыя розныя прадметы нашага жыцця. Народныя майстры ўслаўляюць сваю Радзіму маляўнічымі роспісамі посуду і мэблі.

«Залатая хахлама» — так называецца драўляны размаляваны посуд, які вырабляюць умельцы Расіі. Раслінныя завіткі, ягады рабіны, трускаўкі і вішні, кветкі, якія распусціліся, птушкі, намаляваныя на «залатым» фоне. І раптам сярод россыпу кветак можна



**Поль Сезан.**
Персікі і грушы

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ўбачыць чароўную Жар-птушку. Дзіўна, як мастакам пры дапамозе залатой, чырвонай, зялёнай і чорнай фарбаў удаецца перадаць усю гучнасць і яркасць прыроднага свету. Дзякуючы іх майстэрству просты драўляны посуд стаў дзіўна прыбраным.



Хахламскі роспіс

У Беларусі народныя ўмельцы любілі ўпрыгожваць куфры. Куфар доўгі час быў асноўным прадметам мэблі. У ім захоўвалі вопратку, абрусы, упрыгажэнні. На куфрах спалі, паклаўшы пярыну. Беларускія майстры ўпрыгожвалі куфры размаляванымі расліннымі ўзорамі. Часцей за ўсё гэта былі кветкі ў квадратных або прамавугольных рамках.



Беларускі куфар

Ідэя ўзаемасувязі чалавека і прыроды праявілася і ў архітэктуры. Адзін з самых вядомых дамоў у свеце — Дом над вадаспадам у Амерыцы. Яго спраектаваў архітэктар Фрэнк Лойд Райт.



**Фрэнк Лойд Райт.** Дом над вадаспадам (штат Пенсільванія, ЗША)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Аўтар праекта некалькі гадоў жыў у Японіі і паспрабаваў перадаць асаблівасць японскай культуры ў сябе на радзіме — наблізіць чалавека да прыроды. Дом як быццам вырастае з прыроды і з'яўляецца яе часткай.

Многія архітэктары спрабавалі ў сваіх праектах перадаць пэўныя формы прыроды, напрыклад: ільдзіну, айсберг, плады, алмаз. Адным з самых незвычайных сучасных дамоў у свеце, вобраз якога навеяны прыроднай формай, з'яўляецца дом-«кактус» у Нідэрландах. Яго спраектавалі архітэктары Бэн Хю́ген і Джа́спер Джа́герс. Жылы дом быццам створаны з пялёсткаў кветак або парасткаў кактуса. На адкрытых тэрасах пасаджаны расліны, дзякуючы чаму ствараецца ўражанне, што дом падобны на расліну.

> Прырода зачароўвае мастакоў сваёй дасканаласцю. Пры дапамозе фарбаў, формаў, слоў, рытмаў і гукаў чалавек спрабуе наблізіцца да яе і зразумець яе.

### Пытанні і заданні

1. Што прыцягвае мастакоў у жанрах марыны і нацюрморта? Якія магчымасці даюць майстрам гэтыя жанры?

### Творчая майстэрня

2. Выканайце два фотапейзажы, якія перадаюць розны настрой прыроды. Прыдумайце здымкам выразныя назвы.

3. Складзіце з прыродных матэрыялаў нацюрморт на восеньскую тэму.

4. Прыдумайце і намалюйце эскіз сучаснага будынка, форма якога навеяна матывамі прыроды.

Азнаёмцеся з літаратурнай старонкай на кампакт-дыску па тэме «Свет прыроды ў мастацтве». Выканайце заданні.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Тэма 6

# У свеце казак

Ішоў Бай па сцяне
У чырвоным жупане.
Нёс сямёра лапцей,
І жане, і сабе,
І дзяцёнку па лапцёнку.
Баіць казку ці не?

*З беларускага фальклору*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Валерый Славук.** Бай

## § 14. Што такое казка?

*«Жылі-былі»* або *«У некаторым царстве, у некаторай дзяржаве»*... Ці знаёмыя вам гэтыя радкі? Менавіта так пачынаецца бо́льшая частка казак — пра чараўнікоў і пачвар, прынцаў і прынцэс, пра розныя цудоўныя падзеі. І, вядома ж, пра перамогу дабра над злом.

У казцы прысутнічае чараўніцтва. Прамоўце слова «казка» — і вы адразу апынецеся ў далёкай невядомай выдуманай краіне. Дзякуючы асаблівай таямніцы казка існуе не адно тысячагоддзе. Усё мяняецца вакол, а казка па-ранейшаму перадаецца з пакалення ў пакаленне, ад бабуль да ўнукаў, ад унукаў да праўнукаў...

**Ка́зка** — гэта твор чароўнага, фантастычнага характару, звычайна са шчаслівым канцом.

Дык што ж такое казка? У чым заключаецца яе незвычайная сіла?

Галоўная асаблівасць любой казкі — выдуманы сюжэт, выдуманыя героі і падзеі. Калабок, Бураціна або Сынок-з-кулачок — гэта героі, якіх не існуе ў жыцці. Цяжка ўявіць пралятаючых Змея Гарыныча або





**Аляксей Рэйпо́льскі.**
Ілюстрацыі да казкі Ш. Перо «Папялушка»

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Жар-птушку. Няма ў рэальнасці дывана-самалёта, ботаў-скараходаў або настольніцы-самабранкі. Усе гэтыя героі і прадметы «ажываюць» толькі ў казцы і дзякуючы казцы.

Але тады чаму мы слухаем казкі, затаіўшы дыханне і забываючы пра ўсё на свеце? Што хацеў сказаць вялікі рускі пісьменнік Аляксандр Сяргеевіч Пушкін, напісаўшы словы *«Што за дзіва гэтыя казкі! Кожная ёсць паэма!»*?

На самай справе казка — гэта самы *праўдзівы* жанр у мастацтве! Напрыклад, у казцы французскага пісьменніка Шарля Перо працавітая і сціплая Папялушка за сваё добрае сэрца атрымлівае ўзнагароду. Душэўныя якасці дзяўчыны дазваляюць ёй пераадольваць усе цяжкасці, якія выпадаюць на яе долю кожны дзень. Дзякуючы свайму цярпенню, дабрыні і працавітасці Папялушка знаходзіць свой лёс, сваё шчасце.

Добрую сказку помню с детства.
Хочу, чтобы сказку послушал и ты.
Чтобы подкралась к самому сердцу
И заронила зерно доброты.

*Овсе́й Дриз*

Сюжэт казкі «Папялушка» прызнаны адным з самых папулярных у гісторыі чалавецтва. Магчыма, гэта звязана з тым, што, нягледзячы ні на якія цяжкасці, Папялушка застаецца добрай, чулай і працавітай. Кожны чалавек, які валодае гэтымі якасцямі, заслугоўвае шчасця.

Прыгажосць і цяпло казкі ўніверсальныя. Мову казкі разумеюць усе людзі на планеце. Казка нясе нам радасць і ўпэўненасць. Нешта вельмі важнае... Разгледзець гэта важнае дапамагаюць фантазія і ўяўленне...

## Пытанні і заданні

1. Навошта патрэбна казка?
2. Чаму казкі любяць не толькі дзеці, але і дарослыя?
3. Назавіце некалькі казак, у якіх дабро перамагае зло.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Творчая майстэрня

Прачытайце на кампакт-дыску ўрывак з казкі Шарля Перо «Папялушка». Паглядзіце ў іншых інфармацыйных крыніцах фрагменты аднайменнага фільма Н. Н. Кашаверавай і праслухайце музыку да балета С. С. Пракоф'ева з той жа назвай. Апішыце характар галоўнай гераіні. Выканайце замалёўку вобраза Папялушкі.

**Ш. Перо.** Казка «Папялушка»

## § 15. Пра што расказвае казка?

У кожнай казкі ёсць душа. Каб яе зразумець, трэба акунуцца ў чароўны свет. І тады падарожжа ў свет казкі будзе цікавым і незабыўным. *«Ідзі туды, не ведаю куды, і прынясі тое, не ведаю што»*.

Самыя дзіўныя казкі — чароўныя. У іх абавязкова з'яўляецца герой, з якім адбываюцца разнастайныя цуды і ператварэнні. Напрыклад, Іванка-дурань. У казках ён умее іграць на музычных інструментах, размаўляць з жывёламі, сонцам і ветрам. Казачны Іванка-дурань знаходзіць агульную мову нават з Бабай-ягой.



**Іван Білібін.** Ілюстрацыя «Іван-царэвіч і Жар-птушка»



**Галіна Якімава.** Фарфоравая статуэтка «Іван з Жар-птушкай»



**Мікалай Качаргін.** Ілюстрацыя да казкі Пятра Яршова «Канёк-гарбунок»

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вот полночною порой
Свет разлился над горой,
Будто полдни наступают:
Жары-птицы налетают;
Стали бегать и кричать
И пшено с вином клевать...
...Сам с собою, под лазейкой
Наш Иван ужом да змейкой
Ко пшену с вином подполз —
Хвать одну из птиц за хвост.
«Ой! Конёчек-горбуночек!
Прибегай скорей, дружочек!
Я ведь птицу-то поймал!» —
Так Иван-дурак кричал.

*П. П. Ершóв.*
*Конёк-горбунок*

На самай жа справе Іван зусім не дурань. Паглядзіце на яго ўчынкі больш уважліва. Ён добры, смелы і знаходлівы. Трапляючы ў розныя складаныя сітуацыі, Іван з імі спраўляецца. Ён можа лёгка злавіць Жар-птушку ці Сіўку-бурку, пралезці праз вуха каня і нават акунуцца ў кіпячае малако. Вядома, тут не абыходзіцца без чароўных памочнікаў.

Мудрасць казкі заключаецца ў тым, што зробленае дабро заўсёды вяртаецца дабром.

Асаблівай любоўю карыстаюцца казкі пра жывёл. Галоўныя персанажы такіх казак — звяры, птушкі, рыбы... Хутчэй за ўсё, казкі пра жывёл з'явіліся тады, калі асноўным рамяством чалавека было паляванне і калі ён стаў адамашніваць дзікіх жывёл. Гэта і знайшло адлюстраванне ў фальклоры.

Людзі надзялялі жывёл чалавечымі якасцямі — дабрынёй, розумам, хітрасцю, каварствам, глупствам. Напрыклад, ліса ў народных казках часцей за ўсё хітрая, каварная і пранырлівая. Воўк — дурны і прагны. Зайца народ адлюстраваў у казках баязлівым, казу і быка — упартымі, а мядзведзя — моцным.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Валерый Славу́к.**
Лісіца і воўк. Ілюстрацыя да кнігі «Журавель і чапля»

Лісічка села на спіну ваўка, ён яе і панёс. Вось лісічка-сястрычка сядзіць ды паціху і кажа:

— Біты нябітага вязе, біты нябітага вязе.
— Што ты, кумка, кажаш?
— Я, куманёк, кажу: біты бітага вязе.
— Так, кумачка, так!..

*Лісічка-сястрычка і Шэры воўк*
*Руская народная казка*

Вось як ліса сваёй хітрасцю і кемлівасцю падманула ваўка! А ён, змерзлы і галодны, цягне на сабе сытую і давольную махлярку.

**Увасабле́нне** — гэта прыпісванне неадушаўлёным прадметам якасцей жывых істот.

У казках пра жывёл мы сустракаемся з самымі рознымі якасцямі, уласцівымі чалавеку: адвагай, дабрынёй, смеласцю, подласцю, хітрасцю.

Выкладаюцца казачныя сюжэты так ярка, што гісторыю пра жывёл мы ўспрымаем як рэальную. Мы забываемся пра тое, што перад намі вобразы жывёл, а не людзей.

Яркімі і запамінальнымі з’яўляюцца казкі з выдуманымі героямі: Кашчэем Несмяротным, Змеем Гарынычам, Бабай Ягой, Лясуном, Вадзянікам. Героямі казак бываюць таксама чароўныя прадметы — люстэрка, шапка-невідзімка, жывая вада.

Я был в избушке на курьих ножках.
Там всё как прежде. Сидит Яга.
Пищали мыши и рылись в крошках.
Старуха злая была строга.
Но я был в шапке, был в невидимке...

*К. Д. Бальмонт.*
*У чудищ*

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

З усіх казачных герояў вобраз Бабы Ягі асабліва спадабаўся майстрам мастацтваў. Ён шматгранна ўвасоблены ў мастацкіх творах. У скульптурным малюнку Арцемія Лаўрэнцьевіча О́бера Баба Яга глядзіць на нас злосна, нядобрымі вачыма. Яе суровая знешнасць палохае. Што задумала яна?



**Арцемій Обер.**
Баба Яга

Зусім іншую Бабу Ягу мы сустракаем у мастацкім фільме «Марозка» Аляксандра Артуравіча Ро́ў. Заўважыўшы, што герой не палохаецца яе, Баба Яга пачынае яму дапамагаць.

У мультфільме сучаснага рэжысёра Га́ры Ба́рдзіна «Лятучы карабель» Бабкі-ёжкі канчаткова губляюць свой страшны вобраз: яны спяваюць прыпеўкі, весяляцца і зусім не збіраюцца нікога крыўдзіць.

**М. П. Мусаргскі.** Цыкл «Карцінкі з выстаўкі» («Хатка на курыных ножках»)

Незвычайна ярка і выразна раскрыў вобраз Бабы Ягі Мадэ́ст Пятро́віч Му́саргскі ў музычнай п'есе «Хатка на курыных ножках». Рэзкія скокі ў мелодыі, незвычайнае спалучэнне гукаў, хуткая змена тэмпу ствараюць імітацыю вядзьмаркі, якая ляціць у ступе.

Баба Яга розная. Менавіта гэта цягне мастакоў да дадзенага казачнага вобраза.

Усе казкі апавядаюць нам пра дабро і зло, праўду і крыўду, пра радасць і гора. Пра тое, што трэба супрацьстаяць несправядлівасці і дапамагаць слабым. Пра любоў да Радзімы, сям'і, людзей. А фантастычны пачатак толькі ўзмацняе праўдзівасць, надаючы глыбокі сэнс кожнай казачнай гісторыі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Пытанні і заданні

1. Успомніце казку, у якой галоўныя героі — жывёлы, выдуманыя прадметы.

2. Якая казка вам асабліва падабаецца? Хто галоўны герой? Перакажыце сюжэт.

## Творчая майстэрня

3. Прыдумайце разам з аднакласнікамі гісторыю, у якой традыцыйныя героі казак апынуліся б у сучасным свеце. Прыдумайце сваёй казцы выразную назву.

# § 16. Казачны вобраз у мастацтве

Казкі выклікаюць цікавасць, абуджаюць добрыя пачуцці і эмоцыі. Магчыма, менавіта таму многія мастакі з такім задавальненнем і, галоўнае, павагай звяртаюцца да казачных сюжэтаў і герояў. Жыццё казкі не спыняецца ніколі!



**Аляксандр Ку́ркін.**
Ілюстрацыя да «Казкі пра цара Салтана…»

…«Да на свете,
Говорят, царевна есть,
Что не можно глаз отвесть.
Днём свет божий затмевает.
Ночью землю освещает —
Месяц под косой блестит,
А во лбу звезда горит.
А сама-то величава,
Выступает, будто пава;
Сладку речь-то говорит,
Будто реченька журчит.
Только, полно, правда ль это?»
Князь со страхом ждёт ответа.
Лебедь белая молчит
И, подумав, говорит:
«Да! Такая есть девица»…
…Лебедь тут, вздохнув глубоко,
Молвила: «Зачем далёко?
Знай, близка судьба твоя,
Ведь царевна эта — я».

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Тут она, взмахнув крылами,
Полетела над волнами
И на берег с высоты
Опустилася в кусты,
Встрепенулась, отряхнулась
И царевной обернулась...

*А. С. Пушкин.*
*«Сказка о царе Салтане...»*

І ўсё ж сярод мноства казак ёсць асаблівыя. Іх сюжэты мы пазнаём адразу — па першым слове, па знаёмым радку, па імёнах герояў. Менавіта такой казкай з'яўляецца «Казка пра цара Салтана...».

Аляксандр Сяргеевіч Пушкін быў захоплены народнай казкай пра цудоўную Царэўну Лебедзь і на аснове яе сюжэта стварыў новы паэтычны вобраз.

Гісторыю А. С. Пушкіна пра Царэўну Лебедзь можна расказаць з дапамогай унікальных кніжных ілюстрацый, створаных мастакамі да гэтай казкі. Адным з лепшых ілюстратараў рускіх казак стаў Іван Якаўлевіч Білібін. Ён працаваў у вельмі выразнай і пазнаваемай манеры. Вобразы, створаныя да казак А. С. Пушкіна, перадаюць атмасферу даўніны і чароўнага свету.

Да 100-гадовага юбілею паэта кампазітар Мікалай Андрэевіч Рымскі-Корсакаў стварыў оперу «Казка пра цара Салтана». Музыка гучыць лёгка і нязмушана. Мы пазнаём мелодыі і рытмы народных





**Іван Білібін.**
Ілюстрацыі да «Казкі пра цара Салтана...»

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

песень і скокаў. Асабліва запамінальнымі з’явіліся выяўленчыя знаходкі ў аркестравых эпізодах оперы. У аркестравым уступе «Тры цуды» чутны святочныя фанфары, званы, маршавыя інтанацыі шырокай хады марскіх віцязяў.

Белый лебедь, лебедь чистый,
Сны твои всегда безмолвны,
Безмятежно-серебристый,
Ты скользишь, рождая волны.

*К. Д. Бальмонт*

Першая карціна IV дзеі оперы прысвечана вобразу Царэўны Лебедзі. Павольна, плаўна, спакойна разгортваецца мелодыя ў выкананні струнных музычных інструментаў. І вось ён, цуд: прыгожы вобраз Царэўны паступова ўзнікае ва ўсёй сваёй веліччы.

**М. А. Рымскі-Корсакаў.** Опера «Казка пра цара Салтана» («Палёт чмяля»)

Мастаком у пастаноўцы оперы быў Міхаіл Андрэевіч Ўру́бель — вядомы рускі жывапісец. Касцюмы, створаныя па яго эскізах, выклікалі ў публікі захапленне.

Партыю Царэўны Лебедзі выконвала жонка Врубеля — Надзея Іванаўна Забэла-Урубель. Пад уражаннем загадкавага вобраза Царэўны, увасобленага спявачкай, мастак піша карціну «Царэўна Лебедзь».

Тонкая, вытанчаная, з лёгкай усмешкай, гераіня ў вобразе Царэўны Лебедзі ўражвае і захапляе адначасова! На карціне адлюстраваны момант пераўвасаблення грацыёзнай птушкі ў юную дзяўчыну. Паварочваючы да гледача свой твар, яна нібы запрашае нас стаць сведкамі гэтага цуду.



**Міхаіл Урубель.**
Царэўна Лебедзь

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Пáлехскі куфэрак
«Царэўна Лебедзь»

**Дэкаратыўна-прыкладнóе мастáцтва** — гэта від мастацтва, у якім ствараюцца адначасова прыгожыя і карысныя творы.

Казачныя сюжэты і героі знаходзяцца вакол нас і ў паўсядзённым жыцці. Паглядзіце ўважліва — на посудзе, вопратцы, ручніках і іншых прадметах хатняга ўжытку можна сустрэць казачны вобраз.

Царэўна Лебедзь у розным абліччы выяўлена ў мініяцюры. Яркія тоны, шчыльнасць мазкоў, дэкаратыўнасць і ўзорыстасць малюнка — і вось звычайны куфэрак стаў прадметам мастацтва.

Адукацыя і выхаванне выдавецтва

Вось так і глядзіць Царэўна Лебедзь на нас каля двухсот гадоў дзякуючы майстэрству мастакоў. У розных кутках свету рознымі мастацкімі сродкамі «расказваецца казка». А мы дзякуючы мастацтву працягваем захоўваць у памяці казачныя вобразы, не забываючы пра тых людзей, якія калісьці гэтыя вобразы стварылі.

### Пытанні і заданні

1. Разгледзьце ілюстрацыі, прадстаўленыя ў параграфе. Ахарактарызуйце вобраз Царэўны Лебедзі на кожным малюнку.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Як вы думаеце, чаму вобраз Царэўны Лебедзі так любімы майстрамі розных відаў мастацтваў. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Падумайце і адкажыце, якія яшчэ казачныя вобразы прадстаўлены ў мастацтве так шматгранна.

**Творчая майстэрня**

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах мультфільм «Казка пра цара Салтана» І. П. Іванова-Вано і Л. І. Мільчына. Выканайце замалёўку вобраза Царэўны Лебедзі даступнымі сродкамі.

## § 17. Казка старая і новая



**Эдвард Э́рыксэн.**
Русалачка
(г. Капенгаген, Данія)

Казкі, створаныя народам, перадаюцца з пакалення ў пакаленне. На іх аснове пісьменнікі, мастакі і кампазітары складаюць новыя сюжэты. У іх знаёмыя і любімыя героі становяцца ўдзельнікамі новых прыгод.

Шырока вядомая дзіўная гісторыя пра тое, як Русалачка цаной свайго жыцця выратавала прынца. Гэта гісторыя так падабаецца майстрам мастацтва, што стала крыніцай натхнення для стварэння новых твораў.

У вуснай народнай творчасці русалка — гэта міфічная істота, якая жыве ў воднай стыхіі. Вобраз маладой прыгожай дзяўчыны з доўгімі валасамі і рыбіным хвастом сустракаецца ў легендах і паданнях розных народаў свету. Чаго толькі не прыдумвалі ў народзе пра русалак! Але самае галоўнае, што яны з вады выходзяць да людзей. У адных казках русалкі палохаюць людзей, у іншых — дапамагаюць ім, ратуюць ад смутку і нягод.

Адзін з самых цікавых сюжэтаў прадставіў дацкі казачнік Ханс Крысція́н А́ндэрсэн у казцы «Русалачка».

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Дзіўнае дзіця была гэта русалачка: такая ціхая, задуменная... Іншыя сёстры ўпрыгожвалі сябе ўсякай усячынай, якая дастаўлялася ім з разбітых караблёў, а яна любіла толькі свае чырвоныя, як сонейка, кветачкі ды прыгожага белага мармуровага хлопчыка, які ўпаў на дно мора з карабля, што загінуў. Русалачка пасадзіла каля статуі чырвоную плакучую вярбу, якая цудоўным чынам разраслася; галіны яе перавешваліся праз статую і хіліліся на блакітны пясок, дзе вагаўся іх фіялетавы цень: вяршыня і карані дакладна гулялі і цалаваліся адзін з адным!

У казцы Андэрсэна русалачка — добрая, мілая і пяшчотная. Яе сэрца напоўнена любоўю да людзей, жаданнем дапамагаць ім. Яна таксама, як і чалавек, гуляе, радуецца, захапляецца, любіць слухаць казкі.

Больш за ўсё любіла русалачка слухаць расказы пра людзей, якія жывуць наверсе, на зямлі. Старая бабуля павінна была распавядаць ёй усё, што толькі ведала, пра караблі і гарады, пра людзей і пра жывёл. Асабліва займала і здзіўляла русалачку, што кветкі на зямлі пахлі, — не тое што тут, у моры! — што лясы там былі зялёнага колеру, а рыбкі, якія жылі ў галінах, цудоўна спявалі. Бабуля называла рыбкамі птушачак, інакш унучкі не зразумелі б яе: яны ж зроду не бачылі птушак...



**Іван Білібін.**
Ілюстрацыя да казкі «Русалачка»

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

І калі ў легендах і міфах русалка — адмоўная гераіня, якая губіць людзей, то ў казцы Андэрсэна русалачка палюбіла прынца і пакутуе ад непадзеленага пачуцця. Яна здзяйсняе дабро для чалавека і гіне за яго.

Дзякуючы Х. К. Андэрсэну русалачка назаўжды засталася ў памяці людзей як вобраз светлы, паэтычны, ахвярны. Сіла мастацтваператварыла міфічную русалку ў яркую рамантычную істоту.

У сумнай гісторыі паяўляецца прастор для фантазіі. Глядач атрымлівае магчымасць прыдумаць новы канец, новую сюжэтную лінію. І гэты шлях бясконцы!

Падарожжа русалачкі з казкі Х. К. Андэрсэна на гэтым не заканчваецца...

Казкі не бываюць старымі або новымі. Калі адну і тую ж гісторыю расказваць некалькі разоў, атрымаецца мноства новых гісторый. Так і ў мастацтве. Дзякуючы сродкам мастацкай выразнасці знаёмыя казачныя вобразы атрымліваюць новае ўвасабленне і новае аблічча.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ выдавецтва

### Пытанні і заданні

1. Разгледзьце вобразы русалачкі, прадстаўленыя ў параграфе. Якія з іх вам падабаецца больш за ўсё?

2. Падбярыце 5–6 азначэнняў да выявы русалачкі. Складзіце з іх дапамогай моўны партрэт галоўнай гераіні казкі Х. К. Андэрсэна.

### Творчая майстэрня

Праслухайце ў інфармацыйных крыніцах песеньку Русалачкі з анімацыйнага фільма У. Дзіснея «Русалачка». Выканайце замалёўку вобраза русалачкі, сугучную музычнаму вобразу мультфільма.

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах фільм У. Бычкова «Русалачка». Падумайце, чым адрозніваецца сюжэт фільма ад казкі Х. К. Андэрсэна.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Тэма 7

# Сям'я ў мастацтве

Сапраўдную сям'ю звязваюць не вузы крыві, але вузы павагі і радасці...

*Рычард Бах*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Фёдар Славянскі.** Сямейны партрэт на балконе

# § 18. Мая сям'я

*«Мая сям'я...»* Пры гэтых словах кожны чалавек уяўляе нешта вельмі асабістае, вельмі важнае для яго. Дома, сярод блізкіх, людзі адчуваюць сябе спакойна і ўпэўнена. Таму многія мастакі з асаблівым задавальненнем пісалі сябе сярод членаў сям'і, падкрэсліваючы любоў і павагу да іх.

Рускі мастак Фёдар Міхайлавіч Славя́нскі на карціне «Сямейны партрэт» паказаў сваю сям'ю на балконе ў цёплы летні дзень. Дзеці гуляюць, бацька з маці нешта абмяркоўваюць, а строгая бабуля дае павучанні ўнуку.

У карціне шмат дэталей. Яны распавядаюць нам пра інтарэсы і захапленні членаў сям'і. Гэты сямейны партрэт можна доўга разглядаць і нават «слухаць», уяўляючы гукі, якія напаўнялі гэты далёкі цёплы дзень.

Барыс Міхайлавіч Кустодзіеў намаляваў членаў сваёй сям'і за вячэрняй гарбатай. Промні заходзячага сонца мякка асвятляюць усіх, хто сабраўся каля самавара. Але асабліва ярка яны выяўляюць малых — сына і дачку мастака. Так жывапісец паказвае нам самае каштоўнае, самае светлае ў сваёй сям'і — дзяцей.



**Барыс Кустодзіеў.**
На тэрасе

Бываюць у жыцці сям'і і забаўныя моманты. Уладзімір Ягоравіч Макоўскі адлюстраваў сям'ю мастака. На некаторы час галоўным тут стала не творчасць, а тыя клопаты, што прычыняе дарослым дзіця, якое плача. Нават бацька-жывапісец перастаў займацца сваёй адказнай працай. Адчуваецца, што ён глядзіць на тое, што адбываецца, з усмешкай, і яго воклічы ўліваюцца ў агульны хор галасоў.

Рускі мастак Васіль Міхайлавіч Максімаў на карціне «Бабуліны казкі»

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Уладзімір Макоўскі.**
Сям'я мастака

паказаў многіх сваіх сваякоў і аднавяскоўцаў. Паглядзіце, як зачаравана слухаюць расказчыцу і дзеці, і дарослыя, якія сабраліся ў хаце. Значыць, яна робіць гэта таленавіта.

В зимний вечер по задворкам
Разухабистой гурьбой
По сугробам, по пригоркам
Мы идём, бредём домой.
Опостылеют салазки
И садимся в два рядка
Слушать бабушкины сказки
Про Ивана-дурака.



**Васіль Максімаў.**
Бабуліны казкі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

И сидим мы, еле дышим.
Время к полночи идёт.
Притворимся, что не слышим,
Если мама спать зовёт.
Сказки все. Пора в постели...
Но а как теперь уж спать?
И опять мы загалдели,
Начинаем приставать.
Скажет бабушка несмело:
«Что ж сидеть-то до зари?»
Ну, а нам какое дело —
Говори да говори.

*С. А. Есенин.*
*Бабушкины сказки*

**Гра́фіка** — від выяўленчага мастацтва, у якім выкарыстоўваюцца лініі, штрыхі і кропкі.

Добра, калі ўся сям’я разам. Расстанне гняце і засмучае людзей, якія любяць адзін аднаго. У час Вялікай Айчыннай вайны вершы і песні пра каханне блізкіх падтрымлівалі і тых, хто ваяваў, і тых, хто чакаў




**Анатоль Тычына.**
Гравю́ра
«У разбураным горадзе»

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

абаронцаў з фронту. А калі воіны вярталіся дадому з Перамогай, радасць сустрэчы з сям'ёй была бязмернай. Гэта пачуццё адлюстравалі многія савецкія мастакі.

У гады вайны большасць беларускіх гарадоў і вёсак было разбурана. Не абышла гэта доля і горад Мінск. Мастак Анато́ль Мікала́евіч Тычы́на паказаў у гравюры «У разбураным горадзе» не толькі руіны, але і ўсхваляваны надпіс, які пакінулі для родных тыя, каму ўдалося выратавацца.

Як бачыце, пра сям'ю можна расказаць нават тады, калі ні адной чалавечай фігуры на малюнку няма.

У сям'і чалавек нараджаецца і сталее. Сям'я дапамагае, абараняе, настаўляе. Кожны чалавек марыць, каб яго сям'я была самай лепшай, самай шчаслівай. І як горка бывае, калі гэтыя мары не спраўджваюцца. Розныя падзеі здараюцца ў жыцці сям'і — рознымі настроямі і думкамі дзеляцца з намі майстры мастацтваў.

### Пытанні і заданні

1. Французскі пісьменнік Эміль Заля пісаў: «Аснова сямейнага шчасця ў дабрыні, шчырасці, спагадлівасці». Знайдзіце сярод твораў, прадстаўленых у параграфе, прыклады такіх адносін.

2. Прачытайце верш С. А. Ясеніна «Бабуліны казкі». Якія гісторыі любяць расказваць у вашай сям'і? Падзяліцеся з аднакласнікамі.

### Творчая майстэрня

3. Выканайце малюнак на тэму «Мая сям'я».

4. Якія вершы і песні пра сям'ю вы ведаеце? Выканайце адзін з гэтых твораў.

## § 19. Традыцыі і падзеі ў сям'і

Жыццё кожнай сям'і поўнае розных падзей. Адны з іх важныя толькі для яе членаў. Пра іншыя ведаюць сябры, сваякі і ў залежнасці ад абставін віншуюць, суцяшаюць, прыходзяць на дапамогу.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Адной з найважнейшых падзей у жыцці сям'і становіцца нараджэнне дзіцяці. Сябры, родныя віншуюць бацькоў нованароджанага, дораць падарункі. А вось першы крок малога — свята толькі для бацькоў. Малюнак французскага мастака Жана Франсуа Міле «Першыя крокі» — адна з самых светлых прац майстра. Паглядзіце, якія выразныя жэсты ўсіх, каго мы бачым у гэтай простай і кранальнай сцэне.

Галандскі мастак Вінсэнт Ван Гог стварыў жывапіснае палатно па малюнку Міле. У адным з пісем ён пісаў, што рабіць карціны па малюнках Міле — значыць не столькі іх капіраваць, колькі перакладаць на іншую мову. І сапраўды, пад пэндзлем Ван Гога сюжэт не проста напоўніўся колерам, ён загучаў інакш: больш свежа, звонка, весела.

Як бачыце, значэнне мае не толькі від мастацтва: Жан Франсуа Міле стварыў графічны твор, а Вінсэнт Ван Гог — жывапісны. Важнай з'яўляецца творчая індывідуальнасць аўтара — яго ўспрыманне свету і людзей, яго імкненне перадаць гледачу свой душэўны стан.

Старажытнарымскі рэльеф са сцэнамі жыцця хлопчыка, якога звалі Карнэ́лій Ста́цый, дазваляе нам прасачыць некалькі этапаў яго жыцця. У першай сцэне маці корміць немаўля, а бацька задуменна назірае за гэтым. У наступным эпізодзе малое сядзіць на руках у бацькі і цягнецца ручкай да яго барады. У цэнтральнай частцы



**Жан Франсуа Міле.**
Першыя крокі



**Вінсэнт Ван Гог.**
Першыя крокі (па карціне Міле)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Старажытнарымскі рэльеф са сцэнамі жыцця Карнэлія Стацыя

рэльефу мы бачым, як хлопчык запрог козліка ў цацачную калясніцу і кіруе гэтым складаным відам «транспарту». У апошняй сцэне Карнэлій, які крыху падрос, адказвае бацьку вывучаны ўрок. Такія моманты надоўга застаюцца ў памяці членаў сям'і, якія жывуць у любві і спагадзе.

Увагу жывапісцаў прыцягвалі самыя розныя падзеі сямейнага жыцця. На карціне французскага мастака П'ера Агюста Рэнуара дзве дзяўчыны развучваюць новую п'есу для фартэпіяна. На карціне



**П'ер Агюст Рэнуар.**
Дзяўчыны за фартэпіяна



**Фёдар Рашэтнікаў.**
Прыбыў на канікулы

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

савецкага мастака Фёдара Паўлавіча Рашэ́тнікава хлопчык-суворавец дакладвае дзядулі: «Прыбыў на канікулы!»

Бываюць у жыцці людзей і цяжкія дні... Так, у сям'і мінскага дваранiна Эдварда Вайніловіча здарылася страшная трагедыя: заўчасна пайшлі з жыцця сын і дачка. Няўцешныя бацькі вырашылі ў памяць пра іх пабудаваць храм. Зараз храм у гонар святых Сымона і Алены — так клікалі дзяцей Эдварда Вайніловіча — знаходзіцца ў самым цэнтры горада Мінска. За яркі колер яго часта называюць Чырвоным касцёлам.

**Х. К. Андэрсэн.** Казка «Дзікія лебедзі»

**В. М. Канашэвіч.** Ілюстрацыі да казкі «Дзікія лебедзі»

У многіх творах мастацтва паказана, як аддана ставяцца адзін да аднаго браты і сёстры. Якія важныя ў цяжкую хвіліну любоў і падтрымка родных людзей! Тэма самаахвярнасці чалавека ў імя сваіх родных атрымала ўвасабленне ў адным з лепшых твораў дацкага пісьменніка Ханса Крысціяна Андэрсэна — «Дзікія лебедзі». Любоў і мужнасць Элізы — галоўнай гераіні казкі — выратавалі жыццё адзінаццаці яе братам. Гэты сюжэт натхніў многіх дзеячаў мастацтва на стварэнне новых арыгінальных твораў.



Касцёл святых Сымона і Алены (г. Мінск, Беларусь)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У кожнай сям'і адбываюцца і радасныя, і сумныя падзеі. Кожная з іх можа стаць тэмай мастацкага твора.

### Пытанні і заданні

1. Да якіх відаў мастацтва адносяцца творы, прадстаўленыя ў параграфе?

2. Якія традыцыі і падзеі вашай сям'і знайшлі адлюстраванне ў хатнім фотаархіве?

### Творчая майстэрня

Прачытайце на кампакт-дыску казку Х. К. Андэрсэна «Дзікія лебедзі». Пазнаёмцеся з кніжнымі ілюстрацыямі В. М. Канашэвіча. Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах аднайменны мультфільм М. М. Цеханоўскага. Ахарактарызуйце сродкі мастацкай выразнасці гэтых твораў.

## § 20. Дарослыя і дзеці

*«Мамы, таты, нам без вас — усё роўна, што вам без нас!»* — гэта словы з аповесці Сяргея Уладзіміравіча Міхалкова «Свята непаслушэнства». Дарослыя так знерваваліся з-за непаслушэнства сваіх дзяцей, што вырашылі сысці з горада. Спачатку дзеці без бацькоў весяліліся, сваволілі. Але потым аказалася, што без дапамогі дарослых немагчыма вырашыць нават самыя маленькія праблемы. І дзецям стала сумна і нават страшна...

Мастакі, перш чым прыступіць да працы, уважліва назіраюць за ўзаемаадносінамі дарослых і дзяцей, разважаюць над убачаным, затым перадаюць свае ўражанні ў творах мастацтва. Часцей за ўсё ў гэтых творах гучыць матыў клопату пра дзяцей і абароны іх ад усялякіх



**Надзея Крандзіеўская.**
Бацька і сын

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Ляонас Жукліс.**
Сям'я

бед і напасцяў. Выразней за ўсё такое імкненне адлюстроўвае жэст. Паглядзіце на скульптурны партрэт «Бацька і сын» Надзеі Васільеўны Крандзіеўскай. Жэсты, павароты галоў перадаюць, з аднаго боку, даверлівасць і ласку хлопчыка, з другога — сілу і пяшчоту мужчыны ў адказ.

Літоўскі скульптар Ляонас Жукліс стварыў скульптурную групу «Сям'я», якая знаходзіцца ў Вільні. Паглядзіце, якія плаўныя лініі ўтвараюць контур кампазіцыі. Малое нібы спачывае ў мяккім кокане, які ўтвораны фігурамі бацькоў. Цёплы колер каменя на фоне снегу ўспрымаецца як нешта сагравальнае, а на фоне зеляніны — як увасабленне трываласці і надзейнасці.



**Рэмбрант.**
Партрэт Цітуса, які чытае кнігу



**Ілья Рэпін.**
Страказа (партрэт дачкі)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Бацькі з задавальненнем назіраюць за тым, як растуць і сталеюць іх дзеці, і захоўваюць гэта з дапамогай фота- і відэаздымкі.

А мастакі, асабліва тыя, якія жылі і працавалі ў ранейшыя часы, малявалі партрэты сваіх дзяцей.

Галандскі жывапісец Рэмбрант вельмі любіў свайго адзінага сына Цітуса. У тыя стагоддзі далёка не ўсе дзеці навучаліся грамаце, а Цітус праявіў схільнасць да навукі. Таму бацька нярэдка маляваў хлопчыка са сшыткамі і кніжкамі і вельмі ганарыўся сваім адукаваным сынам. Непаседа-дачка, якая сядзіць на перакладзіне, стала гераіняй карціны Ільі Яфімавіча Рэпіна.

Барыс Міхайлавіч Кустодзіеў стварыў шмат партрэтаў сваёй дачкі Ірыны. Вось яна, зусім маленькая, на руках у сваёй мамы. Вясна, квітнее бэз. І, здаецца, водар кветак ахутвае фігуру маці з дзіцём, нібы духмянае воблака. А вось Ірына ўжо ўпэўнена стаіць на моцных ножках, зацiснуўшы ў руцэ букет кветак. Гэта карціна яркая і святочная, як дзіцячая цацка.



**Барыс Кустодзіеў.**
Бэз



**Барыс Кустодзіеў.**
Партрэт Ірыны Кустодзіевай
з сабакам Шумкам

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сям'я — адна з галоўных каштоўнасцей у жыцці людзей. Майстры мастацтва дапамагаюць нам гэта зразумець, адчуць, даюць магчымасць палюбавацца шчаслівымі сем'ямі і паспачуваць тым, у каго нешта не ладзіцца. Кожны з нас можа стаць мастаком і захаваць свет сваёй сям'і.

## Пытанні і заданні

1. Параўнайце партрэт Цітуса работы Рэмбранта і партрэты дачкі Ірыны мастака Б. М. Кустодзіева. Ахарактарызуйце каляровую гаму гэтых работ.

Прачытайце на кампакт-дыску верш А. Л. Барто «Асаблівае даручэнне». У чым заключаецца камічнасць сітуацыі?

**А. Л. Барто.** Верш «Асаблівае даручэнне»

## Творчая майстэрня

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах фільм «Свята непаслушэнства» Ю. Калішэра. Пафантазіруйце, якое свята можа парадаваць усіх членаў сям'і. Прыдумайце для гэтага свята выразную назву.

Азнаёмцеся з музычнай старонкай на кампакт-дыску па тэме «Сям'я ў мастацтве».

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Тэма 8
# Свет дзяцінства ў мастацтве

Самыя моцныя і ўплывовыя ўспаміны амаль заўсёды тыя, якія застаюцца з дзяцінства.

*Ф. М. Дастаеўскі*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Іван Хруцкі.** Партрэт дзяўчынкі ў блакітнай сукенцы

# § 21. Такія розныя дзеці...



**Зінаіда Серабракова.**
Каця з нацюрмортам



**Мікалай Ге.**
Партрэт Вольгі Паўлаўны Кастычовай

Майстры мастацтва заўсёды любілі маляваць дзяцей. Напэўна, таму, што чытаць пра дзяцей, глядзець на іх выявы і слухаць пра іх займальныя гісторыі падабаецца ўсім. Дарослым — таму, што ўсе дарослыя былі калісьці дзецьмі. А дзецям — таму, што гэта пра іх...

Дзеці, як і ўсе людзі наогул, бываюць розныя: вясёлыя і сумныя, таварыскія і недаверлівыя, бесклапотныя і сур'ёзныя. Усю гэту разнастайнасць пачуццяў, настрояў і спрабуюць перадаць мастакі ў сваіх творах.

Напрыклад, мастачка Зінаіда Яўгенаўна Серабракова любуецца лёгкім і бестурботным характарам сваёй дачкі Каці. Такой жа рухомай паўстае юная гераіня балета Сяргея Сяргеевіча Пракоф'ева «Рамэ́а і Джулье́та» ў сцэне «Джульета-дзяўчынка».

А вось зусім іншы вобраз. Вользе Кастычовай усяго 11 гадоў. Яна расце ў сям'і навукоўца, шмат чытае і разважае. Аўтар партрэта, мастак Мікалай Мікалаевіч Ге, звяртае нашу ўвагу на сур'ёзнасць і задуменнасць дзяўчынкі. У назве карціны нават даецца яе імя па бацьку.

Партрэты дзяцей часта пісаў і беларускі жывапісец Іван Фаміч Хруцкі. На «Партрэце дзяўчынкі ў блакітнай сукенцы» гераіня апранута так, як прынята было апранаць дзяцей з дваранскіх сем'яў у 19 стагоддзі. На ёй кароткая шаўковая сукенка з фальбонамі, з-пад якой бачны доўгія карункавыя штонікі, на нагах — мяккія скураныя

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

боцікі. Побач вялікі капялюш з блакітнымі стужкамі з такога ж шоўку, як і сукенка. Можна ўявіць, як будзе выглядаць юная модніца, калі капялюш апынецца ў яе на галаве. Твар дзяўчынкі выказвае гонар: *«Я пазірую мастаку»*.

Выява маленькага сабачкі дапаўняе карціну, робячы абстаноўку па-хатняму ўтульнай. На лаўцы — кошык з пышнымі кветкамі. Іван Хруцкі любіў дапаўняць выявы людзей раскошнымі букетамі. Прыгажосць кветак падкрэслівае дасканаласць знешнасці мадэлі.

**Мадэ́ль** — чалавек, які пазіруе мастаку.

Зараз разгледзім партрэты хлопчыкаў. На палатне Валянціна Аляксандравіча Сярова — парывісты і ўражлівы Міка Марозаў. Малога цяжка было прымусіць сядзець спакойна і пазіраваць мастаку. Ён на ўсё рэагуе вельмі эмацыянальна. Але дарослыя не перашкаджаюць яго бурным рэакцыям, асабліва калі гэта водгук на творы мастацтва. Хлопчык вырасце і пасля стане аўтарытэтным мастацтвазнаўцам. А эмацыянальнасць застанецца.

Безназоўны хлопчык у саламяным капелюшы, паказаны І. Ф. Хруцкім, відаць, сваю ролю выконвае паслухмяна. І ўсё ж стаяць спакойна



**Валянцін Сяроў.**
Партрэт Мікі Марозава



**Іван Хруцкі.**
Хлопчык у саламяным капелюшы

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Васіль Трапінін.**
Партрэт сына Арсенія

з кошыкам вінаграду сумна і цяжка. Дзіця стамілася, і мастак дакладна перадаў нам яго стомлены погляд. Усе дэталі партрэта прыгожыя: пышная, прысабраная па рукавах і каўняры кашуля, прыгожа сплецены кошык, на капелюшы — пяро паўліна. Аднак уражанне ад карціны больш сумнае, чым радаснае.

Свайго сына Арсенія выдатны рускі мастак Васіль Андрэевіч Трапі́нін адлюстраваў спакойным і задуменным. Відаць, што жывапісец ганарыцца сваім сынам — перад намі свабодная, ясная і вольная душа.

Таленавітыя мастакі як чараўнікі. Яны нярэдка прадчуваюць ці проста сілай уяўлення ствараюць будучыню сваіх мадэлей. Гэта адчуваецца ў работах многіх майстроў.

## Пытанні і заданні

1. Уважліва разгледзьце «Партрэт сына Арсенія» В. А. Трапініна. Якія выразныя сродкі выкарыстоўвае мастак для таго, каб перадаць характар і настрой хлопчыка?

Праслухайце ў інфармацыйных крыніцах музыку да балета С. С. Пракоф’ева «Рамэа і Джульета» — сцэну «Джульета-дзяўчынка». Што агульнае ў характарах Джульеты і дзяўчынкі Каці на партрэце З. Я. Серабраковай «Каця з нацюрмортам»?

## Творчая майстэрня

Праслухайце ў інфармацыйных крыніцах уверцюру кампазітара С. Манюшкі «Зімовая казка». Паспрабуйце ўлавіць сюжэт, задуманы аўтарам. На аснове «Зімовай казкі» прыдумайце гісторыю пра каго-небудзь з дзяцей, чые партрэты пазначаны ў гэтай тэме. Абмяркуйце свае ідэі з аднакласнікамі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 22. Занятк і і захапленні дзяцей

Дзецям сумна сядзець без справы. З самага маленства іх займаюць гульні і цацкі. Мастакі ўважліва назіраюць за захапленнямі і заняткамі дзяцей і распавядаюць пра іх у сваіх творах.



**Ганс Гальбейн Малодшы.**
Партрэт Эдуарда VI
у дзяцінстве

Спадчынніку англійскага прастола Эдуарду VI не было і трох гадоў, калі яго партрэт напісаў нямецкі мастак Ганс Гальбе́йн Малодшы. Жывапісец пастараўся надаць паставе малога каралеўскую велічнасць, а залатая бразготка ў руцэ хлопчыка выглядае амаль як атрыбут каралеўскай улады.

Дзеці з простых сем'яў гулялі з самаробнымі цацкамі і любілі іх пры гэтым ніколькі не менш.

Дзяўчынка з лялькай — адна з любімых тэм многіх мастакоў. Паспрабуем параўнаць два партрэты, створаныя рознымі майстрамі. Паглядзіце, як клапатліва дзяўчынкі трымаюць сваіх лялек, якія розныя пачуцці выклікаюць цацачныя сяброўкі ў сваіх гаспадынь.



**Карл Ле́мах.**
Варка



**Васіль Трапі́нін.**
Дзяўчынка з лялькай

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Аляксей Венецыянаў.**
Спячы пастушок

Далёка не заўсёды дзецям удавалася гуляць і весяліцца. Юны пастушок на карціне Аляксея Гаўрылавіча Венецыянава ўстаў задоўга да світання. Да поўдня ён зусім стаміўся. Хлопчык прыхінуўся да дрэва і сам не заўважыў, як заснуў.

Знакамітая карціна Васіля Рыгоравіча Пярова «Тройка», створаная ў 19 стагоддзі, уразіла сучаснікаў мастака. Цяжкае бязрадаснае жыццё бедных дзяцей, намаляваных на палатне, прымусіла дарослых адчуць віну перад тымі, хто пазбаўлены дзяцінства.

Зімовае змярканне. Завіруха. Два хлопчыкі і дзяўчынка запрэгліся ў сані і з цяжкасцю цягнуць па гарадской вуліцы велізарную абледзянелую бочку з вадой. Дзеці выбіліся з сіл. Рэзкі вецер прадзімае наскрозь іх падраную вопратку. Нейкі добры чалавек дапамагае ім уцягнуць сані на пагорак.

Пяроў назваў карціну «Тройка». Колькі болю і горычы ў гэтай назве! Мы прывыклі да песень пра заліхвацкую тройку, пра рэзвую тройку, а тут — тройка змучаных дзяцей. Да назвы карціны — «Тройка» — Пяроў прыпісаў: «Вучні майстравыя вязуць ваду»...

*У. І. Парудамінскі.*
*«Пяроў. Тройка»*



**Васіль Пяроў.**
Тройка

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Мікалай Багданаў-Бельскі.**
За кніжкай

Дзеці любяць чытаць, але яшчэ больш — слухаць. Паглядзіце, з якой цікавасцю слухаюць дзяўчынкі сваю сяброўку, якая чытае кніжку ўслых. Як адухоўлены твары дзяцей, якія выразныя ў іх вочы, накіраваныя ў нязведаную далечыню, на карціне Мікалая Пятровіча Багда́нава-Бельскага «За кніжкай». У якіх мірах, у якіх краінах яны цяпер апынуліся?

У гады пасля Вялікай Айчыннай вайны ў многіх дзяцей не было цацак. І тады хлопчыкі разам з бацькамі або педагогамі сталі самі майстраваць цацкі з падручных матэрыялаў, гуляць з імі ці дарыць малышам. Менавіта такіх хлопчыкаў адлюстраваў мастак Яўген Аляксандравіч Ка́цман.



**Яўген Кацман.**
Умелыя рукі



**Лізавета Шчыпаніна, Канстанцін Цвяткоў, Арцём Касцевіч** (гімназія № 41, г. Мінск, Беларусь). Праект «Школа будучыні»

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сучасныя дзеці таксама любяць майстраваць. Але сёння з’явілася магчымасць выкарыстоўваць больш складаныя тэхналогіі, напрыклад камп’ютарную графіку. Дзеці нярэдка ствараюць праекты, якімі ўсур’ёз цікавяцца дарослыя.

Успамінаючы свае дзіцячыя заняткі і захапленні, назіраючы за гульнямі дзяцей, мастакі падказваюць нам, як важна ўважліва ўзірацца ў тое, што з’яўляецца для нас звычайным і паўсядзённым у жыцці.

### Пытанні і заданні

1. Уважліва разгледзьце партрэты дзяўчынак з лялькамі, прадстаўленыя ў параграфе. Падбярыце вызначэнні, што характарызуюць настрой дзяўчынак і іх стаўленне да лялек, якія яны трымаюць у руках.

**Ф. П. Рашэтнікаў.** Ізноў двойка

Тэме навучання прысвечаны карціна Ф. П. Рашэтнікава «Ізноў двойка» і анімацыйны фільм Ю. А. Прыткова «У краіне нявывучаных урокаў». Паглядзіце фрагменты фільма ў інфармацыйных крыніцах. Патлумачце, у чым заключаецца камічны эфект кожнай гісторыі.

### Творчая майстэрня

2. Выканайце партрэт свайго сябра (малюнак, лепка, фатаграфія). Падумайце, які настрой (захапленне ці талент) мадэлі вам бы хацелася перадаць. Ахарактарызуйце свой твор.

## § 23. Дзеці і мастацтва

Дзеці любяць маляваць, спяваць, многім падабаецца танцаваць, а хтосьці спрабуе пісаць вершы. Некаторыя бяруцца за засваенне мастацтва ўсур’ёз: адпраўляюцца ў мастацкія школы, студыі і пачынаюць вывучаць законы творчасці.

На карціне рускага жывапісца Івана Іванавіча Фі́рсава «Юны мастак» намалявана майстэрня. На сценах — карціны прафесіянальных мастакоў. На стале — скульптурны жаночы бюст і мадэль

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

чалавечай фігуры на шарнірах (такія мадэлі дапамагалі вучням ствараць кампазіцыі з разнастайнымі паставамі герояў).

Хлопчык-падлетак, які ўжо засвоіў многія навыкі свайго рамяства, працуе над партрэтам дзяўчынкі. Маленькая мадэль стамілася, і мама (або няня) дапамагае ёй захоўваць патрэбнае становішча. Юны мастак пакуль незадаволены сваім малюнкам: ён здолеў намаляваць знешнасць дзяўчынкі, але яшчэ не змог перадаць яе ўнутраны стан.



**Іван Фірсаў.**
Юны мастак

Рускі жывапісец Васіль Максімавіч Макси́маў, калі быў яшчэ падлеткам, пачаў вучыцца ў іканапіснай майстэрні. Будучы дарослым паспяховым мастаком, ён наведаў родныя мясціны, і ўспаміны пра дзяцінства нахлынулі на яго. Вынікам стала карціна «Будучы мастак».



**Васіль Максімаў.**
Будучы мастак



**Васіль Максімаў.**
Зноў на радзіме



**Франц Хальс.**
Спяваючыя хлопчыкі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Павел Фядотаў.**
Партрэт Н. П. Ждановіч за фартэпіяна



**Мікалай Багданаў-Бельскі.**
Талент

Малюнкі, на якіх дзяцей вучаць музыцы, можна сустрэць ужо на старажытнагрэчаскіх вазах. Калі ў Еўропе з'явіўся нотны запіс, дзеці сталі вучыцца чытаць ноты. Такіх хлопчыкаў паказаў галандскі мастак Франц Хальс на карціне «Спяваючыя хлопчыкі». Павел Андрэевіч Фядóтаў адлюстраваў за клавішамі дванаццацігадовую Надзею Ждановіч. На дзяўчынцы форменны ўбор вучаніцы Інстытута высакародных дзяўчын. У гэтай навучальнай установе дзяўчынак абавязкова вучылі не толькі навукам, але і мастацтвам.

Здольнасць адгукацца на прыгажосць — таксама свайго роду талент. Паглядзіце, як усхвалявала дзеда таленавітая ігра хлопчыка на карціне Мікалая Пятровіча Багдáнава-Бéльскага «Талент».

У біблейскай прытчы гаворыцца: *«не зарывай талент у зямлю»*. Гэта азначае, што кожны з нас павінен уважліва ставіцца да свайго таленту, працаваць над ім, развіваць на радасць людзям.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Пытанні і заданні

1. Параўнайце сюжэты карцін В. М. Максімава «Будучы мастак» і «Зноў на радзіме». Як колеравая гама перадае настрой мастака ў абедзвюх карцінах?

Разгледзьце на кампакт-дыску карціну мастака У. Я. Макоўскага «Тры пакаленні». Чаму карціна так названая?

**У. Я. Макоўскі.** Тры пакаленні

### Творчая майстэрня

2. Выканайце малюнак (фатаграфію) на тэму «Мае захапленні».

## § 24. Дзеці мараць пра будучыню

Дзеці разам са сваімі роднымі разважаюць пра тое, што з імі будзе, калі яны вырастуць. Часам дарослыя хочуць прыспешыць сталенне сваіх дзяцей. І робяць гэта па-рознаму, напрыклад, з дапамогай «дарослага» адзення...

Даўней спецыяльнага адзення для дзяцей не было. Хлопчыкаў і дзяўчынак з вышэйшых слаёў грамадства апраналі ў такія ж мундзіры і цяжкія жорсткія сукенкі, як і ў дарослых. А на галаву даводзілася надзяваць пудраны парык. Дзяцей з сялянскіх сем'яў таксама апраналі як дарослых.



**Андрэс Лопес Паланка.** Партрэт інфантаў дона Карласа і дона Ферна́нда

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Луі Кармантэль.**
Леапольд Моцарт з сынам Вольфгангам і дачкой Нанэ́рль

Часам бацькі настолькі дакладна планавалі будучыню сваіх дзяцей, што прасілі мастака адлюстраваць яе ў карціне. У парадным партрэце прыдворны мастак А́ндрэс Ло́пес Пала́нка адлюстраваў зусім маленькіх сыноў іспанскага караля. Малодшы — у цяжкім, расшытым каштоўнымі камянямі, каралеўскім уборы, а старэйшы — у манаскай сутане ў знак таго, што ў будучым ён прысвяціць сябе рэлігіі.



**Мікалай Багданаў-Бельскі.**
Вуснае лічэнне

Бацькі радуюцца, калі заўважаюць у сваіх дзяцей якія-небудзь таленты. Сям’я Во́льфганга Амадэ́я Мо́царта праславілася на ўсю Еўропу дзякуючы музычнаму дару маленькага хлопчыка. Ён стаў першым дзіцем, які адправіўся на сапраўдныя гастролі. На малюнку французскага мастака Луі́ Кармантэ́ля маленькі Моцарт паказаны з бацькам і старэйшай сястрой. Хлопчык упэўнена адчувае сябе за клавесінам і апрануты па-дарослаunion.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Карціна «Вуснае лічэнне» Мікалая Пятровіча Багданава-Бельскага — свайго роду падзяка мастака чалавеку, які дапамог яму стаць прафесіянальным жывапісцам. Сяргей Аляксандравіч Рачы́нскі быў памешчыкам у тых краях, дзе з'явіўся на свет хлопчык. Дзіця так і запісалі — Багданаў, гэта значыць «Богам дадзены». С. А. Рачынскі адкрыў бясплатную школу для сялянскіх дзяцей, дзе і выкладаў. Педагог заўважыў талент аднаго са сваіх вучняў і дапамог яму атрымаць прафесіянальную мастацкую адукацыю.



**Яўген Вучэціч.** Помнік воіну-вызваліцелю (г. Берлін, Германія)

Другую частку свайго прозвішча жывапісец атрымаў «з рук» цара. Той, падпісваючы дыплом акадэміка жывапісу, дадаў да прозвішча «Багданаў» назву яго роднага павета — «Бельскі».

Дзеці 20 стагоддзя сталі марыць аб прафесіях, звязаных з навукамі і тэхнікай, як хлопчыкі на карціне савецкага жывапісца Аляксандра Аляксандравіча Дэйнэ́кі. Але грымнула вайна, хлопцы пайшлі на фронт. Хтосьці не вярнуўся... Савецкі скульптар Яўген Віктаравіч



**Аляксандр Дэйнэка.** Будучыя лётчыкі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вучэціч у мануменце «Помнік воіну-вызваліцелю» паказаў гераізм савецкага салдата, які выратаваў нямецкую дзяўчынку. Яго твар напружаны, вобраз рашучы і непрыступны. Левай рукой воін беражліва прыціскае да сябе дзяўчынку, у правай трымае цяжкі меч, які сімвалізуе перамогу.

У мастацкіх вобразах увасабляецца тое, пра што мы думаем, аб чым марым. Пільна ўзіраючыся ў люстэрка мастацтва, мы становімся разумнейшымі, больш добрымі, лепшымі.

### Пытанні і заданні

Прачытайце на кампакт-дыску апавяданне А. Гайдара «Гарачы камень». Што такое шчасце з пункту гледжання галоўнага героя?

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах мультфільм І. В. Кадзюковай «Дзіўная вячэра на Куццю». Што такое шчасце з пункту гледжання хлопчыка?

Верш «Пра хлопчыкаў і дзяўчынак» (пер. С. Я. Маршака)

**А. Гайдар.** Апавяданне «Гарачы камень»

### Творчая майстэрня

Прачытайце на кампакт-дыску верш з англійскай народнай паэзіі ў перакладзе С. Я. Маршака «Пра хлопчыкаў і дзяўчынак». Выканайце малюнак (фатаграфію) на тэму «З чаго толькі зроблены... (хто? — выберы сам)».

Азнаёмцеся з літаратурнай старонкай на кампакт-дыску па тэме «Свет дзяцінства ў мастацтве». Выканайце заданні.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Тэма 9

# Вобраз маці ў мастацтве

Сэрца маці — гэта бездань, у глыбіні якой заўсёды знойдзецца месца дараванню.

*А. Бальза́к*



**Эміль Мунье́.** Гульня з немаўлём

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 25. Веліч матчынага сэрца

Мама ў жыцці кожнага чалавека — самы блізкі і дарагі чалавек. Ласкавая або строгая, сумная ці вясёлая, рашучая або нясмелая — яна заўсёды побач з намі. Мама ўвасабляе дабро, ласку, клопат. Матчына сэрца не ведае меж. Яно чыстае, чулае, міласэрнае, мяккае. У ім заўсёды знойдзецца месца цярпенню, суперажыванню, высакароднасці, дараванню.

Ва ўсе часы вобраз маці захапляў творцаў і натхняў на стварэнне вялікіх твораў мастацтва. У большасці мастацкіх твораў мама — шчыры, спагадлівы сябар, настаўнік і абаронца.

Клопат маці аб сваім малышу — у цэнтры скульптурнай кампазіцыі Фёдара Фёдаравіча Каме́нскага. Мастак адлюстраваў адзін з хвалюючых момантаў у жыцці кожнай маці — першыя спробы яе дзіцяці самастойна хадзіць. Скульптар паказаў маці засяроджанай, адухоўленай і шчаслівай. Ледзь улоўная ўсмешка на твары выказвае найвялікшую радасць. Яе шырока разведзеныя ў бакі рукі агароджваюць малыша ад магчымых удараў. Балансуючы з боку ў бок, дзіця робіць свае першыя няўмелыя крокі.



**Фёдар Каменскі.**
Першыя крокі

Адзін з эпізодаў жыцця сваёй сям'і паказаў у карціне «Раніца» Барыс Міхайлавіч Кустодзіеў. Ён намаляваў сваю жонку, якая купае іх першае дзіця. Матчыны пачуцці выяўляюцца праз радасны стан немаўляці. Малыш гуляе, і нам здаецца, што мы чуем удары яго далонек па вадзе. Прамяні ранішняга сонца заліваюць пакой цяплом і святлом, падкрэсліваюць жывую, радасную атмасферу.

Іншыя якасці матчынай душы раскрываюцца ў мануменце ў гонар маці-патрыёткі Настассі Фамінічны Купрыя́навай. Аўтары паказваюць жанчыну мужную,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Барыс Кустодзіеў.**
Раніца

геraічную, якая валодае велізарнай сілай духу. Перад намі — рэальная гісторыя. Маці адпраўляе пецярых сыноў на вайну. Прыціснуўшы руку да грудзей, яна быццам развітваецца са сваімі дзецьмі, якія рашуча крочаць насустрач маючым адбыцца баталіям. Яе накіраваны ўдалечыню позірк і пастава поўныя малення, веры і надзеі...

Патрыятычныя пачуцці выклікае вобраз маці на карціне беларускага мастака Міхаіла Андрэевіча Саві́цкага «Партызанская мадонна». У яе поглядзе душэўны боль, трывога... Суровыя фарбы вайны ствараюць кантраст з улагоджаным абліччам мадонны. Яна задуменная,



**А. М. Заспі́цкі, І. Я. Міско́, М. А. Рыжанко́ў.**
Манумент у гонар маці-патрыёткі Купрыянавай

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Міхаіл Савіцкі.**
Партызанская мадонна



**Кузьма Пятроў-Водкін.**
Маці

яе погляд поўны надзеі. Аднак за знешнім спакоем маці хаваецца ўнутранае напружанне.

Кузьма Сяргеевіч Пятро́ў-Во́дкін шмат разоў звяртаўся да тэмы мацярынства. Угледзьцеся ў адну з яго работ. Сялянка корміць сваё дзіця, седзячы на траве. У карціне ўвасоблены вобраз Маці ўсіх часоў. Пяшчота, клопат, трывога за будучыню дзіцяці напаўняюць яе позірк задуменнасцю. Яркія фарбы адзення жанчыны сімвалізуюць Жыццё. Разгледзьце пейзаж, які служыць фонам. Шырокі паварот магутнай ракі абмывае зялёны бугор — сімвал самой Зямлі.

Эпохі прыходзяць і сыходзяць. А Маці і Дзіця — вечныя...

У розныя часы ў розных відах і жанрах мастацтва тэма мацярынства раскрывалася па-свойму. Але заўсёды ў вобразе маці паказаны найвышэйшыя душэўныя якасці чалавека — дабрыня, чуласць і пяшчота.

## Пытанні і заданні

1. Якія матчыны якасці вы лічыце самымі галоўнымі? Падбярыце ў вучэбным дапаможніку або ў інфармацыйных крыніцах жывапісныя і скульптурныя кампазіцыі, у якіх перададзены адзначаныя вамі якасці.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Паглядзіце на ілюстрацыі, прадстаўленыя ў параграфе. Якая з іх вам падабаецца больш за ўсё? Чаму?

**Творчая майстэрня**

3. Выканайце фотапартрэт сваёй мамы (бабулі або любога блізкага чалавека). Ахарактарызуйце атрыманы вобраз.

Усе мамы спяваюць сваім дзецям калыханкі. Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах фрагмент мультфільма «Калыханкі свету» Е. В. Скварцовай. Праслухайце калыханкі з фільмаў «Падкідыш» кампазітара М. М. Крукава і «Пра Чырвоную Шапачку» кампазітара А. Л. Рыбнікава. Выканайце малюнак на тэму «Калыханка».

## § 26–27. Свяшчэнны вобраз маці

Са старажытных часоў мастакі імкнуліся ўвасобіць у вобразе маці боскі пачатак. Багіня-маці заўсёды паказвалася як жанчына, якая дае жыццё ўсяму жывому на Зямлі. Яе ўшаноўвалі, ёю захапляліся, яе ўсхвалялі...

Розныя народы ўяўлялі Багіню-маці па-рознаму. Гэта было звязана з вераваннямі і традыцыямі, што складаліся. У культуры Старажытнага Егіпта Багіню-маці Ісіду часцей малявалі ў вобразе жанчыны, якая сядзіць на троне. Захавалася мноства статуэтак Ісіды з немаўляткам Горам на руках. У іх майстры паказваюць Ісіду як маці-карміцельку. Фігуры Ісіды і немаўляці Гора пазбаўленыя руху, быццам застылі ў камені на стагоддзі.

У Старажытнай Грэцыі матчыны пачуцці мастакі нярэдка адлюстроўвалі ў вобразе багіні прыгажосці, кахання, урадлівасці — Афрадыты.



Фаянсавая статуэтка Багіні Ісіды. Старажытны Егіпет

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Тэракотавая статуэтка «Афрадыта з Эротам»

**Іко́на** — свяшчэнная выява рэлігійных сюжэтаў і вобразаў.



Ікона Божай Маці «Замілаванне» (г. Маларыта, Беларусь)

У адной з тэракотавых статуэтак — «Афрадыта з Эротам» — скульптар паказаў цёплыя пачуцці маці да сына. Афрадыта пяшчотна прыціскае да сябе малога, яе погляд поўны любові і клопату. Майстар захаваў адзін з важных момантаў у жыцці дзяцей — гульню. Багіня-маці забаўляе дзіця з дапамогай бразготкі. Немаўля захоплена сочыць за рухам цацкі, а маці не адрывае позірку ад малога.

У хрысціянскай культуры ганаровае месца заняў вобраз Багародзіцы — сімвал веры і чысціні душы.

Яна была пакорная сэрцам, абачлівая ў словах, разважлівая, немнагаслоўная, аматарка чытання... працавітая, цнатлівая ў гаворцы, шануючы не чалавека, але Бога суддзёй сваіх думак. Правілам Яе было нікога не абражаць, для усіх быць добразычлівай, шанаваць старэйшых, не зайздросціць роўным, пазбягаць пахвальбы, быць разважнай, любіць дабрачыннасць.

*Свяціцель Амвросій Медыяла́нскі*

Найвышэйшае пачуццё матчынай любові перадаюць іконы Багародзіцы з немаўлём «Замілаванне». У такіх абразах Багародзіца выяўляецца з немаўлём Хрыстом на руках. Яна пяшчотна прытулілася да яго сваім тварам. Цёплыя абдымкі маці і дзіцяці, мяккасць матчыных рук, задуменны погляд Марыі, які напоўнены смуткам пра трагічны лёс свайго сына, выказваюць пачуццё бязмежнай любові.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Смутак і душэўны боль Багародзіцы, якая аплаквае свайго сына Хрыста, перададзены ў мармуровай скульптурнай кампазіцыі «П’е́та», створанай вялікім майстрам Мікела́нджэла. Далікатная фігура маладой прыгожай жанчыны, у вобразе якой мастак адлюстраваў Дзеву Марыю, трымае на каленях нежывое цела сына. Яе позірк, звернуты да Хрыста, сведчыць аб бязмерным матчыным горы. Адной рукой яна пяшчотна прыціскае да сябе свайго сына, а другая адведзена ў бок, быццам паказвае на непазбежнасць таго, што адбылося.



**Мікеланджэла.**
П’ета

Маці, якая аплаквае свайго сына, — асноўная тэма і ў кантаце Джава́ні Баты́сты Пергале́зі «Stabat Mater». Дзіўна шчырая і простая мелодыя напоўнена сумнымі і адначасова светлымі, узвышанымі інтанацыямі.

Пакора і святло адчуваюцца ў кожнай музычнай фразе.

**І. С. Бах — Ш. Гуно.** Ave Maria

**Дж. Б. Пергалезі.** Stabat Mater (№ 1)

Трывожныя пачуцці маці, якая перажывае за лёс свайго сына, выказаў у карціне «Сіксці́нская мадонна» другі знакаміты італьянскі мастак — Рафаэ́ль. Мадонна з дзіцем, мякка ступаючы па аблоках, спускаецца з нябёсаў на зямлю. Яе погляд накіраваны ўдалячынь і засмучаны будучыняй Хрыста. Сум мы бачым і ў вачах немаўляці. Але карціна, нягледзячы на гэта, успрымаецца ўрачыста. Сама мадонна з немаўлём на руках нібы



**Рафаэль.**
Сіксцінская мадонна

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

выпраменьвае перамогу дабра над злом. Асобы, якія губляюцца ў смузе аблокаў і складаюць фон карціны, — гэта дзеці, якія з надзеяй назіраюць за гэтай сцэнай.

Вобраз маці ў мастацтве з’яўляецца адным з цэнтральных. Яму прысвечана мноства мастацкіх твораў рознага характару — лірычных, трагічных і гераічных. Але ва ўсіх творах мастацтва вобраз маці адухоўлены і паэтычны.

## Пытанні і заданні

1. Разгледзьце ілюстрацыі, прадстаўленыя ў параграфе. Якія пачуцці ў вас выклікае вобраз Багародзіцы на іконе «Замілаванне»?

2. Як вы думаеце, чаму людзі з даўніх часоў схіляюцца перад Багіняй-маці? Патлумачце свой пункт гледжання.

3. Падумайце, чаму вобраз Багародзіцы ў мастацтве перадаецца часцей за ўсё сумным. Аргументуйце сваю пазіцыю.

Праслухайце на кампакт-дыску музычны твор І. С. Баха — Ш. Гуно «Ave Maria». Якім жывапісным і скульптурным творам, прадстаўленым у гэтай тэме, ён адпавядае ў большай ступені?

## Творчая майстэрня

4. Падбярыце да мастацкіх твораў, прадстаўленых у параграфе, вершы, з якімі вы пазнаёміліся на ўроках рускай літаратуры, беларускай літаратуры.

Азнаёмцеся з літаратурнай старонкай на кампакт-дыску па тэме «Вобраз маці ў мастацтве». Выканайце заданні.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Тэма 10
# Вобраз жывёлы ў мастацтве

Каб зразумець, ці ёсць у жывёл душа, трэба самому мець душу.

*А. Швейцэр*



**Ян Брэ́йгель Малодшы.**
Рай

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 28. Чалавек і жывёльны свет

Тэма жывёльнага свету шырокая і шматгранная. Яна мае ў мастацкай культуры глыбокія карані.

У далёкія часы першабытны чалавек не аддзяляў сябе ад прыроды. Ён падоўгу назіраў за жывёламі, іх рухамі і звычкамі. На адных звяроў чалавек паляваў, іншых даводзілася засцерагацца. Невыпадкова выявы звяроў з'явіліся раней, чым выявы людзей. Малюнкі атрымліваліся настолькі дакладнымі і выразнымі, што не перастаюць захапляць і сёння.

Вядома некалькі пячор, у якіх захаваліся малюнкі першабытнага чалавека. Адна з іх знаходзіцца ў Францыі і называецца Ласкó. Скляпенні пячоры пакрытыя выявамі розных жывёл.

На пярэднім плане бык невядомай пароды. Малюючы яго перабольшана доўгія рогі, накіраваныя наперад, мастак як бы кажа нам: «Ён вельмі небяспечны, я яго баюся». Наводдаль — група аленяў. Іх галінастыя рогі ўтвараюць мудрагелісты ўзор. Верагодна, алені і тады былі палахлівыя, у лёгкіх контурах іх фігур не ўтрымліваецца нічога жахлівага. У пячоры ёсць некалькі малюнкаў дзікага каня. Адзін з іх распавядае нам пра тое, дзе пасвіцца жывёла. Вецер прыгінае высокія травы, і грыва каня калышацца ад ветру. Вялікае цела працята дзідай, а магчыма, стралой.





Фрагменты роспісу пячоры Ласко (Францыя)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Прайшло шмат тысяч гадоў з тых часоў, калі былі выкананы гэтыя наскальныя малюнкі. Аднак, уважліва ўзіраючыся ў іх, мы нібы чуем аповед старажытнага майстра пра тое, што яго трывожыць, чаму ён радуецца і на што спадзяецца...



Пастуова чалавек пачаў адамашніваць жывёл — прывучаць некаторых з іх жыць побач з сабой. Займальную гісторыю пра гэта расказаў англійскі пісьменнік і падарожнік Рэдзья́рд Кі́плінг у казцы «Кошка, якая гуляла сама па сабе».

...Дзікі сабака падышоў да ўваходу ў пячору, носам узняў сушаную конскую скуру ды ўцягнуў ноздрамі вабны пах смажанай бараніны. Жанчына, якая глядзела на лапатачную костку, пачула, што сабака нюхае, засмяялася і сказала:

— Вось першы дзікі звер з дзікіх лясоў, што табе трэба?

Дзікі сабака адказаў:

— Мой вораг і жонка майго ворага, што гэта так добра пахне ў дзікім лесе?

Жанчына ўзяла падсмажаную костку барана, кінула яе дзікаму сабаку і сказала:

— Дзікі звер з дзікага лесу, пагрызі і паспрабуй.

Дзікі сабака стаў грызці костку і знайшоў, што яму яшчэ ніколі не даводзілася есці такіх смачных рэчаў. Паеўшы, сабака сказаў:

— Мой вораг і жонка майго ворага, дай мне яшчэ костку!

Жанчына адказала:

— Дзікі звер з дзікага лесу, днём дапамагай майму мужу паляваць, а ўначы



**Віктар Дуві́даў.**
Ілюстрацыі да казкі Рэдзьярда Кіплінга «Кошка, якая гуляла сама па сабе» (г. Масква, Расія, выдавецтва «ДЕТГИЗ», 1956)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ахоўвай яго пячору, тады я буду даваць табе столькі смажаных костак, колькі ты захочаш.

Дзікі сабака ўвайшоў у пячору, паклаў сваю галаву на калена жанчыны і сказаў:

— Мой сябар і жонка майго сябра, днём я буду дапамагаць чалавеку паляваць, а ўначы буду вартаваць вашу пячору.

Пісьменнік быў не толькі таленавітым апавядальнікам, але і здольным малявальшчыкам. Ён сам ілюстраваў свае творы.

З часам людзі перасталі баяцца жывёл. Жыццё звяроў і птушак стала залежаць ад чалавека і яго дзейнасці.

На карціне галандскага мастака Яна Брэ́йгеля Мало́дшага «Рай» у чароўным лесе мірна суседнічаюць ільвы і казулі, малпы і курапаткі, папугаі і чарапахі. Ніхто нікога не баіцца, ніхто ні за кім не гоніцца. Такія «райскія» адносіны магчымы толькі ў ідэальных марах. Аднак фантазія, увасобленая мастаком, заключае глыбокую думку: як было б добра, калі б у свеце зніклі варожасць, злосць і страх.

> Творы мастацтва дапамагаюць нам зразумець, якія адносіны склаліся ў чалавека з тымі, хто лётае, бегае, поўзае і плавае, але не ўмее размаўляць і, магчыма, мае патрэбу ў любові або дапамозе...

выдавецтва

### Пытанні і заданні

1. Уважліва разгледзьце рэпрадукцыю карціны Яна Брэйгеля Малодшага «Рай». Назавіце жывёл, якія на ёй намаляваны. Як вы думаеце, што на карціне з'яўляецца нерэальным?

2. У якім анімацыйным фільме, знятым па казцы Р. Кіплінга, аўтары выкарыстоўвалі вобразы, блізкія да наскальнага жывапісу першабытнага чалавека? Як вы думаеце, чаму былі выкарыстаны такі мастацкі прыём?

### Творчая майстэрня

3. Выканайце малюнак на тэму «Мой хатні гадаванец».

4. Прыдумайце выразную назву для свята (выставы, канцэрта, конкурсу), прысвечанага тэме жывёльнага свету.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 29. Як мастакі малююць жывёл

Многія майстры мастацтва ў сваіх творах ствараюць вобразы жывёл. Жывапісцаў прываблівае ў гэтай тэме магчымасць перадачы разнастайных характараў, прыгажосці рухаў, асаблівасцей знешняга выгляду — мяккай воўны або гладкіх бліскучых пёраў, вільготнай лускі або шышкаватага панцыра.



**Дыега Веласкес.**
Галава аленя

Некаторых майстроў прыцягвае менавіта ўнутраны стан звера, а не яго знешнасць. Іспанскі мастак Дыега Веласкес любаваўся высакароднасцю аленя. Яго карціну можна назваць «партрэтам жывёлы-арыстакрата».



**Паўлюс Потэр.**
Ланцуговы сабака

Галандскі жывапісец Па́ўлюс По́тэр стварыў вобраз геранічнага сабакі, які вартаваў спакой людзей. З-за вясновай лінькі добра прыкметныя дужыя мышцы сабакі. Дзякуючы нізкай лініі гарызонту складаецца ўражанне значнасці намаляванага: надзейны абаронца на пасту.



**Пётр Клот.**
Кабыла з жарабём

Прыгажосць формаў цела жывёлы, натуральнасць пастаў і рухаў прыцягваюць увагу скульптараў. Рускі скульптар Пётр Карлавіч Клот у кампазіцыі «Кабыла з жарабём» здолеў адлюстраваць пяшчоту і мяккасць рухаў жывёл. Адчуваецца далікатнасць жарабяці, якое нядаўна з'явілася на свет.

На працягу многіх стагоддзяў любімай забавай арыстакратаў было паляванне. Асаблівай папулярнасцю карысталася псовае і сакалінае паляванне. Беларускі скульптар Сяргей Афанасьевіч Бандарэ́нка

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Сяргей Бандарэнка.**
Помнік вялікаму князю Альгерду
(г. Віцебск, Беларусь)

вылепіў скульптуру вялікага князя Альгерда, які сядзіць на кані і трымае сокала на руцэ. Кожная цяглiца жывёлы напружана, усё цела скіравана наперад...

Не могуць не захапляць спевы птушак. Гэтым цудоўным пошчакам прысвечаны народныя песні і творы прафесіянальных кампазітараў. Музычныя інструменты і галасы вакалістаў перадаюць прыгажосць спеваў птушак.

Поле зыблется цветами,
В небе льются света волны.
Вешних жаворонков пенья
Голубые бездны полны.

*А. Н. Ма́йков*

**К. Сэн-Санс.** Заалагічная фантазія «Карнавал жывёл». Королевский марш львов

Адна з п’ес цыклу Пятра Ільіча Чайкоўскага «Поры года» называецца «Сакавік. Песня жаўранка». Прадвеснікамі вясны з’яўляюцца птушкі, якія вяртаюцца з цёплых краін. Першымі прылятаюць жаўранкі. Менавіта іх вясновыя пошчакі чуюцца ў мелодыі. Музыка гучыць то летуценна-сумна, то светла, перадаючы адчуванне наступлення вясны. У канцы п’есы ледзь чутны птушыныя пошчакі.

Поўны гумару вакальны нумар прадставіў італьянскі кампазітар Джаакі́на Расі́ні. Яго «Дуэт кошак» з задавальненнем выконваюць самыя знакамітыя оперныя спевакі і спявачкі.

Французскі кампазітар Каміль Сэн-Санс стварыў заалагічную фантазію «Карнавал жывёл». Гэта сюіта складаецца з 14 частак.

Атрымліваючы асалоду ад гукаў музыкі, мы ўяўляем, як перад намі праходзяць велічны леў і куры з пеўнямі, якія знаходзяцца ў пошуках корму, імчацца антылопы, скачуць кенгуру, чуем шчэбет птушак, кукаванне зязюлі... Усе гэтыя і іншыя вобразы стварае незвычайны ансамбль інструментаў.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Мельхіёр дэ Хондэку́тэр.**
Куры і качкі

Майстры ўсіх відаў мастацтва звяртаюцца да тэмы жывёльнага свету, каб паказаць асаблівасці характару і паводзін звяроў і птушак. Дзякуючы творам мастацтва чалавек можа любавацца прыгажосцю.

### Пытанні і заданні

1. Падбярыце некалькі слоў-эпітэтаў да малюнкаў жывёл, якія прапануюцца ў параграфе.

Праслухайце ў інфармацыйных крыніцах музычныя творы П. І. Чайкоўскага «Сакавік. Песня жаўранка» і Ж. П. Рамо «Пераклічка птушак», прадстаўленыя ў параграфе. Чым падобныя вобразы птушак у п'есах абодвух кампазітараў?

Праслухайце ў інфармацыйных крыніцах паланэз № 1 «Паляванне» М. Радзівіла. Якому твору выяўленчага мастацтва, прадстаўленаму ў параграфе, сугучны музычны вобраз?

### Творчая майстэрня

2. Падрыхтуйце вуснае апавяданне на тэму «Мая любімая кніга пра жывёл».

3. Змайструйце з паперы або іншых матэрыялаў маску жывёлы. Прыдумайце ёй арыгінальную назву.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 30. Казачны вобраз жывёлы



Герб г. Гомеля



Герб г. Гродна

Узіраючыся ў творы выяўленчага мастацтва, услухоўваючыся ў музычныя творы, прысвечаныя вобразу жывёлы, мы лёгка пазнаём іх. Майстэрства творцаў дазваляе перадаць усе падрабязнасці знешнасці, звычак і, вядома, характару жывёлы, а таксама непрадказальнасць звера. Пастулова людзі сталі надзяляць жывёл якасцямі, якія ўласцівы чалавеку.

Вобразы добрых звяроў-памагатых, якія выратоўваюць чалавека ў складаных сітуацыях, з'явіліся ў казках. Звяры, птушкі думаюць, размаўляюць і паступаюць, як людзі. Курачка Раба знесла залатое яйка і суцяшае гаспадароў, калі яно разбілася. Сабака, кошка і нават мышка дапамагаюць цягнуць рэпку. Шэры воўк выручае Івана-царэвіча.

Казачныя вобразы жывёл настолькі звыклыя, што не здзіўляюць нас. Звяры сталі носьбітамі



**Станіслаў Цалю́к.**
Помнік вераб'ю
(г. Баранавічы, Беларусь)



**Уладзімір Гаўрыле́нка.**
Помнік бабру
(г. Бабруйск, Беларусь)



Саламяны павук

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пэўных якасцей, якія чалавек хоча бачыць у сябе. У многіх народаў мядзведзь увасабляе сілу, леў і арол — уладу. Гэтыя і іншыя магутныя жывёлы сталі знакамі гарадоў і дзяржаў, што знайшло адлюстраванне ў малюнках гербаў.

У Беларусі ёсць гарады, у якіх стаяць помнікі жывёлам. Так, у Баранавічах паставілі помнік вераб'ю і заснавалі свята ў гонар гэтай маленькай птушачкі. А ў Бабруйску з'явілася некалькі помнікаў бабру — жывёле, у гонар якой названы горад.

Невялікія фігуркі і схематычныя малюнкі жывёл здаўна былі часткай побыту. Для Беларусі традыцыйнымі з'яўляюцца вырабы з жытняй саломы. З яе робяць фігуркі птушак, якія прыносяць шчасце; конікаў, з якімі ў хату ўваходзіць дастатак. Таксама дапаўняюць інтэр'ер складаныя сплеценні павукоў, якія збіраюць усё непрыемнае і злое, што можа здарыцца ў доме. Саламяныя фігуркі недаўгавечныя, таму іх абнаўлялі з кожным новым ураджаем. А саламяных павукоў спальвалі, каб прыбраць з хаты ўсё дрэннае.

Свістулькі з гліны, якія выдаюць гукі, падобныя птушыным спевам, ператварыліся з цягам часу ў маленькіх птушачак. Вышытыя на ручніку птушачкі сталі традыцыйным вясельным узорам.

Адным з сімвалаў Беларусі з'яўляюцца зубры. Белавежская пушча захавала гэтых рэдкіх жывёл ад знішчэння. Фігуры зуброў



Саламяны конь



Свістулькі-птушачкі з гліны



Традыцыйная славянская вышыўка



Зубр (мастацкае шкло)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з саломы, дрэва, гліны, фарфору і шкла ўпрыгожваюць не толькі нашы дамы, але і абшары нашай Радзімы.

За шмат тысячагоддзяў чалавек пераадолеў страх перад жывёламі і навучыўся выкарыстоўваць іх для ўласных патрэб, бачыць прыгажосць. Зараз людзям трэба навучыцца жыць у згодзе з усімі насельнікамі Зямлі, а мастацтва тут — лепшы памочнік.

### Пытанні і заданні

1. Выберыце герб аднаго з гарадоў свету з выявай жывёлы. Што, на ваш погляд, сімвалізуе гэты вобраз? Падрыхтуйце вусны аповед.

2. Успомніце і назавіце вершы, казкі, апавяданні, фільмы, у якіх галоўнымі героямі з'яўляюцца жывёлы.

### Творчая майстэрня

3. Намалюйце эскіз герба дома (класа і г. д.), выкарыстоўваючы вобраз жывёлы.

Азнаёмцеся з літаратурнай старонкай на кампакт-дыску па тэме «Свет жывёл у мастацтве».

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Тэма 11

# Мастацтва ў нашым доме

Дом — гэта там, дзе тваё сэрца...

*Пліній Старэйшы*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Іван Пяле́він.** Пе́ршынец

# § 31. Наш дом – наш свет

Кожны чалавек імкнецца ўпрыгожыць сваё жыллё, зрабіць яго ўтульным і непаўторным. Ва ўладкаванні жылля мы выказваем сваё ўяўленне пра прыгажосць. Наш дом — гэта наш маленькі свет. Якім мы створым яго, такой будзе і атмасфера ў ім. Дом, які напоўнены святлом, іскрыцца вясёлкавымі фарбамі, гучыць радаснай мелодыяй, дорыць яго насельнікам цяпло і ўтульнасць.

Дом як жыллё чалавека вядзе сваю гісторыю са старажытных часоў. У першабытную эпоху жыллём нярэдка служылі пячоры. У роспісах пячор людзі адлюстроўвалі важныя для сябе вобразы — вынікі сваіх назіранняў.

У Старажытным Егіпце ў роспісах сцен розных пабудоў выкарыстоўваўся бытавы сюжэт. У іх прадстаўлены таксама і прыродныя матывы — расліны, звяры, птушкі, рыбы.

Пазней, у эпоху Антычнасці, сталі ўпрыгожваць не толькі сцены, але і падлогі памяшканняў. Шырока ўжывалася мураваная мазаіка. Так была ўпрыгожана віла Рама́на Дэль-Казáле на востраве Сіцылія. Мастакі адлюстравалі лоўлю дзікіх звяроў у Паўночнай Афрыцы. На пясчаных берагах сярод рэдкай расліннасці бачым маладых рымлян, занятых пагрузкай здабычы на караблі для дастаўкі ў Рым. Побач і страусы, сланы, тыгры, буйвалы, антылопы, вярблюды.



Зараснікі з лятаючымі качкамі. Фрагмент роспісу па тынкоўцы (Старажытны Егіпет)



Калідор Вялікага палявання на віле Рама́на Дэль-Казáле (в. Сіцылія, Італія)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Замак Бодыям (Англія)

Пазней людзі сталі ўзводзіць замкі, якія былі цэнтрам уладанняў багатых людзей. Замак служыў як жыллём для ўладальніка, так і сховішчам для жыхароў той мясцовасці ў выпадку нападзення ворагаў.

Звычайна замкі будаваліся на ўзвышшы, сярод лясных масіваў. Тэрыторыю замка, як правіла, акружалі ровам з вадой. Гэта рабілася ў абарончых мэтах. Прыкладам такога збудавання з'яўляецца англійскі замак Бодыям.

Адзін з найбуйнейшых замкаў Беларусі і Усходняй Еўропы знаходзіцца ў гарадскім пасёлку Мір. Мірскі замак мае блізкую да квадрата форму. Яго масіўныя сцены ўмацаваныя пяццю вежамі: чатыры размяшчаліся па кутах, а пятая — у сярэдзіне сцяны. Менавіта ў ёй



**Напалео́н О́рда.**
Мірскі замак (Беларусь)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

знаходзілася ўязная арка. Вежы ўзвышаліся над сценамі і былі ўпрыгожаны белымі нішамі і арнаментам, якія вылучаліся на фоне чырвонай цаглянай кладкі.

На змену замкам прыходзілі раскошныя палацы. У кожным меласся мноства пакояў, упрыгожаных роспісам, ляпнінай і пазалотай. Мэбля, свяцільні, вазы, люстэркі і іншыя прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва адлюстроўвалі густы і запыты людзей, якія жылі ў гэтых палацах.

**Дэко́р** — гэта афармленне, упрыгожванне будынкаў і архітэктурных элементаў пабудовы.

Пры палацах нярэдка разбівалі парк, дзе знаходзіліся скульптуры, фантаны, вадаёмы. Урачыстасць палацам надавала багацце і хараство дэкору.

Тракайскі замак
Сядзіба Хрушчовых-Селязнёвых у Маскве
Дом Ваньковічаў у Мінску

Кожны палац будаваўся па заказе каранаванай асобы і таму ўнікальны. Славу Вялікаму Кацярынінскаму палацу ў Царскім Сяле (цяпер г. Пушкін) прынесла як незвычайнае афармленне фасадаў, так і ўбранне пакояў.

На нябесна-блакітным фоне сцен, падобна пышным аблокам, вылучаюцца белыя ствалы калон. Абрамленне вокнаў у спалучэнні



**Барталаме́а Франчэ́ска Растрэ́лі.**
Вялікі Кацярынінскі палац
у Царскім Сяле (Расія)



**Леана́рд Марко́ні.**
Сядзіба Умястоўскіх
(в. Жэмыслаўль, Беларусь)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з пазалочанай пластыкай, нібы вытканай ззяннем сонечных прамянёў, стварае святочны ўбор будынка.

Сядзібы ў параўнанні з палацамі і замкамі выглядалі значна больш сціплымі. У комплекс шляхецкай сядзібы ўваходзілі палац, гаспадарчыя пабудовы, парк або сад. Звычайна сядзібны дом не меў багатага дэкору, але вылучаўся на фоне паселішча.

### Пытанні і заданні

1. Патлумачце, як вы разумееце знакаміты выраз Эдварда Кока «Мой дом — мая крэпасць».

Уважліва разгледзьце ўсе архітэктурныя збудаванні, прадстаўленыя ў параграфе і на кампакт-дыску. Якое з іх вам падабаецца больш? Патлумачце свой адказ.

### Творчая майстэрня

2. Падрыхтуйце вуснае сачыненне на тэму «Дом, у якім я хачу жыць».

3. Выканайце фатаграфію цікавага, на ваш погляд, будынка, размешчанага ў вашым горадзе, пасёлку. Чым ён вам спадабаўся? Раскажыце пра гэта аднакласнікам.

## § 32. Жыллё сучаснага чалавека

Сучаснае жыллё не падобна на жыллё чалавека, які жыў у мінулых стагоддзях. З канца 19 стагоддзя заможныя гараджане сталі будаваць шыкоўныя асабнякі, якія былі больш падобныя на малень-



**Віктар Мазы́рын.** Асабняк А. Марозава (г. Масква, Расія)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Віктар О́рта.**
Асабняк прафесара
Эміля Таселя
(г. Брусель, Бельгія)

кія палацы. Прыкладам таму з'яўляецца асабняк, збудаваны для Арсенія Марозава — аднаго з найбагацейшых людзей таго часу.

А. Марозаў шмат падарожнічаў і пажадаў пабудаваць дом, які нагадваў бы яму аб паездках у Еўропу. Разгледзьце багаты дэкор сцен, вітыя калоны, разнастайныя ваконныя праёмы. Гэты асабняк дзівіць пышнасцю і па гэты дзень.

Не менш прыгожы асабняк прафесара Эмі́ля Та́селя ў Бруселі. Ён нібы створаны з мудрагелістых раслінных узораў, якія прысутнічаюць у абрамленні лесвіцы, у малюнку мазаічнай падлогі, у дэкоры сцен.

На пачатку 20 стагоддзя людзей перастала здзіўляць раскоша. Яна саступіла месца прастаце і рацыянальнасці. З'явіліся загарадныя вілы з больш прасторнымі памяшканнямі, стрыманыя і элегантныя.

Французскі архітэктар Ле Карбюзье́ праектаваў вілы, цалкам пазбаўленыя дэкору. Віла Саво́й, размешчаная ў парыжскім прадмесці, стала ўзорам прастаты і стрыманасці — ніводнай лішняй лініі, лішняга завітка або ўпрыгажэння...



**Ле Карбюзье.**
Віла Савой
(г. Пуасі, Францыя)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У гэты ж перыяд незвычайны дом для сваёй сям'і ў Маскве пабудаваў рускі архітэктар Канстанцін Сямёнавіч Мельнікаў. Своеасаблівая форма будынка прынесла яму сусветную вядомасць. Дзякуючы шматлікім шасцівугольным вокнам дом атрымаў фантастычна прывабны від.



**Канстанцін Мельнікаў.**
Дом архітэктара
(г. Масква, Расія)

Пасля Вялікай Айчыннай вайны разбураныя гарады забудоўваліся шматкватэрнымі жылымі дамамі. Былі сярод іх і вышынныя будынкі. Адзін з такіх дамоў быў пабудаваны на Кацельнічаскай набярэжнай у Маскве. Падобна непрыступнай гары, ён і дагэтуль узвышаецца над ракой, сваім грандыёзным маштабам нагадваючы цэлы горад. Будынак упрыгожваюць шматлікія вежкі, скульптуры і высокі шпіль з зоркай.

Складаную кампазіцыю мае жылы дом на скрыжаванні вуліц Мінскай і Пушкіна ў горадзе Бабруйску. Яго незвычайны від нагадвае пабудову з канструктара, у якой кожны элемент, які выступае, дапаўняе іншы, ствараючы адзінае цэлае.



**Дзмітрый Чачу́лін, Андрэй Расткóўскі.**
Жылы дом на
Кацельнічаскай набярэжнай
(г. Масква, Расія)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




**Уладзімір Галу́шчанка, Канстанцін Ко́жыч.**
Жылы дом на скрыжаванні вуліц Мінскай і Пушкіна (г. Бабруйск, Беларусь)

Сёння формы дамоў становяцца яшчэ больш разнастайнымі. Яны не толькі адлюстроўваюць усё багацце прыроднага свету, тэхнічныя навіны, але і ўвасабляюць казачна-фантастычныя задумы архітэктараў!

Так, многія сучасныя жылыя дамы, гасцініцы сваім відам нагадваюць звяроў, насякомых, караблі, аўтамабілі, падводныя лодкі. Напрыклад, дом «Науты́лус» мексіканскага архітэктара Хаўе́ра Сенасія́на падобны на мудрагелістую ракавіну малюска.

Праходзіць час, мяняюцца людзі — становіцца іншым іх жыллё. Адно застаецца нязменным: чалавеку неабыякавы дом, у якім ён жыве са сваімі роднымі і блізкімі...



**Хаўер Сенасіян.**
Дом «Наутылус» (г. Наўкальпан-дэ-Хуарэс, Мексіка)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Пытанні і заданні

1. Якія пачуцці выклікаюць у вас архітэктурныя збудаванні, прадстаўленыя ў параграфе? Якое з іх вам спадабалася больш? Чаму?

2. Знайдзіце ў сваім горадзе, пасёлку архітэктурныя збудаванні арыгінальнай формы. Раскажыце пра іх аднакласнікам.

### Творчая майстэрня

3. Выканайце эскіз малюнка шпалер або дывана для афармлення сучаснага гарадскога дома.

4. Выканайце эскіз дома будучыні арыгінальнай формы.

## § 33. Традыцыйнае народнае жыллё

Знешні і ўнутраны выгляд жылля ў сельскай мясцовасці заўсёды адрозніваўся сціпласцю. Залішняя раскоша была недарэчнай. Гэтая асаблівасць вызначыла традыцыі ўбранства і ўпрыгажэння народнага жылля.



Жылы дом (в. Гарадзец, Беларусь)

На тэрыторыі Беларусі традыцыйны жылы дом быў драўляным. Народныя ўмельцы ўпрыгожвалі яго дэкаратыўнай разьбой. Ажурныя драўляныя разьбяныя ўзоры абрамлялі вокны, дзверы, ганак, карнізы і нават куты дамоў. Гэты звычай захаваўся аж да 20 стагоддзя.

**Наро́днае жыллё** — комплекс жылых і гаспадарча-бытавых пабудоў пэўнага народа.

Унутранае ўбранства беларускага народнага жылля — хаты — таксама практычна не змянілася. Падлогу замяняла ўтрамбаваная зямля ці гліна, драўляная падлога была рэдкасцю.

Дах, як правіла, пакрывалі саломай. Дзверы і вокны былі невялікімі, што дазваляла захоўваць у хаце цяпло. Яна абагравалася

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Беларуская хата. Экспазіцыя Мотальскага музея народнай творчасці (в. Моталь, Беларусь)

з дапамогай печы, размешчанай у куце каля ўваходу, а асвятлялася лучнікам.

**Лучні́к** — прылада для асвятлення памяшканняў у выглядзе стойкі з заціскам для лучыны (тонкай трэскі).

Найбольш шануемым месцам у хаце быў так званы чырвоны кут, які ўладкоўвалі ў далёкім куце, па дыяганалі ад печы. Тут вісела іконы, абрамлёныя ручнікамі. У чырвоным куце стаяў стол, засланы абрусам. Хлеб, які звычайна пакідалі на стале, таксама накрывалі ручніком.

Спалі беларусы на спецыяльных дашчатых памостах і размешчаных над імі палацях. Асноўным прадметам мэблі быў куфар, дзе захоўвалі вопратку. Куфры часцей фарбавалі ў сіні ці зялёны колер і распісвалі разнастайнымі ўзорамі ў выглядзе кветак, букетаў, птушак, зорачак, колаў і г. д.



Выцінанка

У святочныя дні жыллё змяняла свой убор. На Каляды ў чырвоным куце падвешвалі саламяных павукоў. Лічылася, што

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

саламяны павук, які качаецца з боку ў бок, ахоўвае дом і прыносіць яго жыхарам шчасце. Перад Вялікаднём, Калядамі і іншымі святамі хату ўпрыгожвалі выцінанкамі.

Ручнікі адыгрывалі важную ролю ў побыце беларусаў. Ткалі іх рознымі спосабамі. Ад абранага спосабу залежаў малюнак. Самымі распаўсюджанымі былі малюнкі з арнаментам у выглядзе квадратаў, трохвугольнікаў, зігзагаў і выяў птушак.

**Выцінанка** — ажурныя ўзоры, выразаныя з паперы і прызначаныя для ўпрыгажэння жылля.

Упрыгожвалі ручнікі вышыўкай. Традыцыйнай для Беларусі з'яўляецца вышыўка крыжыкам з выкарыстаннем нітак двух колераў — чырвонага і чорнага. Краі ручнікоў аздаблялі махрамі або карункамі. Ручнікі выкарыстоўвалі ў абрадах і рытуалах. У вершы Аркадзя Нефрановіча «Ручнікі» раскрываецца іх значэнне ў беларускай культуры.


Ручнік

Ручнік бялюткі для дзіцяці,
Каб чалавек хутчэй акрэп.
І вытканы рукамі маці —
Накрыць гарачы з печы хлеб.
На покуці ў хаце — Бога
Ушанаваны светлы лік.
І адмысловы — у дарогу,
І для нябожчыка ручнік.

Народнае жыллё было разлічана на тое, каб у ім жыла вялікая сям'я. Жылі сціпла, але дружна. Менавіта таму традыцыйнае народнае жыллё было асабліва цёплым і ўтульным.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Пытанні і заданні

1. Назавіце новыя словы, якія звязаны з народным жыллём, — лучнік, куфар... Паглядзіце ў слоўніку значэнне гэтых слоў. Якія прадметы, словы прыйшлі ім на змену?

### Творчая майстэрня

2. Выканайце ўпрыгажэнне для народнага жылля (тэхніка на выбар).

Азнаёмцеся з літаратурнай старонкай на кампакт-дыску па тэме «Мастацтва ў нашай хаце». Выканайце заданні.

## § 34–35. Творчы праект

Навучальны год амаль скончыўся... Вы многаму навучыліся, паспрабавалі адказаць на пытанне «Навошта ж чалавеку неабходна мастацтва?». У кожнага з вас з'явіўся свой адказ. І гэта вельмі важны вынік. Хтосьці адкажа, што з дапамогай мастацтва можна вырашыць складаныя задачы. Хтосьці скажа, што яно дазваляе за кароткі тэрмін апынуцца ў розных частках свету. Для кагосьці гэта магчымасць адпачыць, атрымаць задавальненне. А хтосьці захоча даведацца пра мастацтва яшчэ больш.

Самае галоўнае — гэта тое, што вы навучыліся здзіўляцца, па-новаму глядзець на прадметы і з'явы, якія раней здаваліся вам звыклымі.

Дзіўную гісторыю пра тое, як можна *па-рознаму* глядзець на навакольны свет, расказаў вядомы дзеяч мастацтваў Сяргей Уладзіміравіч Абразцóў.

Дождж... Людзі пад парасонамі... Ну, і што тут дзіўнага? Мокра і ўсё.

А чалавек адкрыў акно насустрач дажджу і здзівіўся яму, і ўзрадаваўся. І перадаў гэтую радасць нам: «Люблю навальніцу ў пачатку траўня, калі вясновы першы гром, як бы гуляючы, грукоча ў небе блакітным». Гэта быў паэт Цютчаў.

І спыніўся іншы чалавек у здзіўленні перад дажджом, і гукі дажджу сталі для яго музыкай. Гэта быў кампазітар Дэбюсі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Лізавета Шчыпаніна, 5 «А» клас.**
Графіка «Матылёк» (гімназія № 41 г. Мінска, 2015/2016 навуч. г., Беларусь)

Прайшоў дождж. Перакінуўся вясёлкавы мост. Не маглі мастакі не здзівіцца вясёлцы, таму што яна каляровая. Вось яны — вясёлкі мастакоў Пусэна, Урубеля, Левітана.

А вучоны сказаў: здзіўляе не тое, што вясёлка каляровая, дзіўна, што гэта — раскладзены ў кроплях вады сонечны прамень...

Зараз давайце ўспомнім, што вы зрабілі сваімі рукамі ў гэтым навучальным годзе. Магчыма, нехта намаляваў мноства малюнкаў. А камусьці было зручна выконваць праект разам з аднакласнікамі. Магчыма, вашы вырабы спатрэбіліся родным і блізкім і зараз упрыгожваюць ваш дом?

Успомніце свае вялікія і маленькія праекты. Раскажыце пра іх...

Вопыт творчай працы вам абавязкова спатрэбіцца. Мы не сумняваемся ў тым, што многія з вас змаглі паглядзець на сябе і сваіх таварышаў па-новаму!

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ЗМЕСТ

Тэма 1. **УВОДЗІНЫ Ў СВЕТ МАСТАЦТВА**

§ 1. Што такое мастацтва? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .6

Тэма 2. **РОЛЯ МАСТАКА Ў МАСТАЦТВЕ**

§ 2. Пра што расказвае мастак? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .12

§ 3. Інструменты і матэрыялы мастака . . . . . . . . . . . . . . . .14

Тэма 3. **ЦУДОЎНАЕ Ў МАСТАЦТВЕ**

§ 4. Прыгажосць у мастацтве і жыцці . . . . . . . . . . . . . . . . .20

§ 5. Пераўтваральная сіла мастацтва . . . . . . . . . . . . . . . . .23

Тэма 4. **ЧАЛАВЕК У МАСТАЦТВЕ**

§ 6. Пра што расказвае партрэт? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .28

§ 7. Чалавек на фоне гісторыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .32

§ 8. Чалавек і праца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .34

§ 9. Вобраз чалавека: рэальны і фантастычны . . . . . . . . . .37

Тэма 5. **СВЕТ ПРЫРОДЫ Ў МАСТАЦТВЕ**

§ 10. Свет прыроды ў мастацтве — глядзім і слухаем . . .42

§ 11. Які настрой у прыроды? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .44

§ 12. Які ў прыроды характар? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .47

§ 13. Як адлюстроўвае прыроду мастак? . . . . . . . . . . . . . .51

Тэма 6. **У СВЕЦЕ КАЗАК**

§ 14. Што такое казка? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .56

§ 15. Пра што расказвае казка? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .58

§ 16. Казачны вобраз у мастацтве . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .62

§ 17. Казка старая і новая . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .66

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Тэма 7. **СЯМ’Я Ў МАСТАЦТВЕ**
§ 18. Мая сям’я. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .70
§ 19. Традыцыі і падзеі ў сям’і. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .73
§ 20. Дарослыя і дзеці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .77

Тэма 8. **СВЕТ ДЗЯЦІНСТВА Ў МАСТАЦТВЕ**
§ 21. Такія розныя дзеці... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .82
§ 22. Заняткі і захапленні дзяцей . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .85
§ 23. Дзеці і мастацтва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .88
§ 24. Дзеці мараць пра будучыню . . . . . . . . . . . . . . . . . . .91

Тэма 9. **ВОБРАЗ МАЦІ Ў МАСТАЦТВЕ**
§ 25. Веліч матчынага сэрца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .96
§ 26–27. Свяшчэнны вобраз маці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .99

Тэма 10. **ВОБРАЗ ЖЫВЁЛЫ Ў МАСТАЦТВЕ**
§ 28. Чалавек і жывёльны свет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .104
§ 29. Як мастакі малююць жывёл . . . . . . . . . . . . . . . . . . .107
§ 30. Казачны вобраз жывёлы. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .110

Тэма 11. **МАСТАЦТВА Ў НАШЫМ ДОМЕ**
§ 31. Наш дом — наш свет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .114
§ 32. Жыллё сучаснага чалавека . . . . . . . . . . . . . . . . . . .117
§ 33. Традыцыйнае народнае жыллё . . . . . . . . . . . . . . . .121
§ 34–35. Творчы праект . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .124

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(Назва і нумар установы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**Грачова** Вольга Алегаўна
**Захарына** Юлія Юр'еўна
**Колбышава** Святлана Іванаўна

# МАСТАЦТВА
# (айчынная і сусветная мастацкая культура)

Вучэбны дапаможнік для 5 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання
(з электронным дадаткам)

Рэдактары *Я. А. Пастушэнка, Т. К. Слаута*
Дызайн *В. К. Жалудковай, К. У. Максімавай, І. І. Радаман*
Мастацкія рэдактары *Д. В. Кашавар, К. К. Шастоўскі*
Мастак вокладкі *В. К. Жалудкова*
Камп'ютарны набор *В. Ю. Лагун*
Камп'ютарная вёрстка *В. Ю. Лагун*
Карэктары *Я. А. Пастушэнка, Т. К. Слаута, Г. Д. Мікіцюк*

*У мастацкім афармленні выдання выкарыстаны ілюстрацыі з wikimedia.org, shutterstock.com і іншых крыніц (поўны пералік на дыску).*

Падпісана да друку 03.10.2016. Фармат 70 x 100 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 10,4. Ул.-выд. арк. 6,5 + 4,0 эл. дад. Тыраж 16 830 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/19 ад 14.11.2014.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўская, 20, 220024, г. Мінск.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне